**Паміж музыкай і грамадскай працай**

СТАР. 3

**Бранятанкавы маршал Якубоўскі**

СТАР. 5

**Правільнае салодкае на свята**

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

14 СНЕЖНЯ 2016 г. СЕРАДА № 241 (28351)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# НАДЗЕЙНЫ І ПРАДКАЗАЛЬНЫ ПАРТНЁР

## Менавіта так успрымаецца на міжнароднай арэне Беларусь

**Аб гэтым Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка заявіў, прымаючы даверчыя граматы ад паслоў Буркіна-Фасо, Інданезіі, Канады, Літвы, Люксембурга, Манголіі, Фінляндыі, Францыі, Эрытрэі, Эстоніі, Апостальскага нунцыя ў Беларусі.**

Прэзідэнт звярнуў увагу на важнасць таго, што сёлета Беларусь адзначае 25-годдзе суверэнітэту. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за гэтыя гады быў не толькі пераадолены эканамічны спад, выкліканы развалам СССР, але і фактычна адноўлена сацыяльна арыентаваная дзяржава. Да цяперашняга часу праведзена сістэмная мадэрнізацыя практычна ўсіх галін і сектараў эканомікі, развіваюцца прынцыпова новыя напрамкі гаспадарчай дзейнасці.

Кіраўнік дзяржавы лічыць невыпадковым той факт, што Беларусь усё часцей асацыюецца з астраўком стабільнасці ў рэгіёне, вызнаючы такія каштоўнасці, як выключныя міралюбнасць і бяспека. «Мы нязменна выступаем за рашэнне канфліктных сітуацый цывілізаваным шляхам, за сталом перагавораў. Без прымянення ваеннай сілы, без аказання палітычнага і эканамічнага ціску. Сёння Мінск стаў значнай пляцоўкай для ўрэгулявання рэгіянальных крызісаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама нагадаў, што ў верасні гэтага года сфарміраваны новы склад Нацыянальнага сходу, і выказаў надзею на пашырэнне міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь адкрыта да супрацоўніцтва і рэалізацыі ўзаемавыгадных праектаў. «Беларуская эканоміка з'яўляецца адной з самых адкрытых у свеце. Сёння поруч з прыняццем мер, накіраваных на актывізацыю бізнесу, мы паглыбляем міжнародныя гандлёва-эканамічныя сувязі», — нагадаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пераканаў таксама, што замежныя краіны пры развіцці эканамічных адносін з Беларуссю ацэняць сапраўды бязмежныя перспектывы, якія вынікаюць з магчымасці доступу на агульны рынак ЕАЭС, адным з заснавальнікаў якога наша краіна з'яўляецца.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь удзяляе асаблівую ўвагу супрацоўніцтву з краінамі Еўрапейскага саюза, прасоўваючы канструктыўную ідэю «інтэграцыі інтэграцый», і ў гэтым плане ўскладае надзеі ў першую чаргу на сваіх суседзяў.

З Літвой наша краіна дастаткова эфектыўна працуе ў транспартна-транзітнай і інвестыцыйнай галінах. Як адзначыў Прэзідэнт, трэба працягваць рухацца ў гэтым кірунку і максімальна выкарыстоўваць існуючы патэнцыял. З Эстоніяй Беларусь гатова пашыраць кантакты ва ўсіх сферах, уключаючы палітычнае і гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Кажучы пра перспектывы супрацоўніцтва з Фінляндыяй, Прэзідэнт звярнуў увагу на выкарыстанне сучасных фінляндскіх тэхналогій у мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў.

Ацэньваючы Францыю «як аднаго з палітычных і эканамічных «цяжкавагавікоў» Еўрапейскага саюза і ўсяго свету», Прэзідэнт выказаў надзею на падтрымку гэтай краінай беларускага курсу на шматвектарную знешнюю палітыку і большую ўцягнутасць Беларусі ў міжнародныя эканамічныя адносіны. Улічваючы статус Люксембурга як аднаго з фінансавых цэнтраў Еўропы, Беларусь выступае за нарошчванне кантактаў у галіне эканомікі, перш за ўсё ў крэдытна-інвестыцыйнай сферы.

Аляксандр Лукашэнка пераканаў, што пры новым Апостальскім нунцыі двухбаковае супрацоўніцтва з Ватыканам захаваецца і ўмацуе традыцыйна дружалюбны, плённы характар адносін. «Для нашай краіны Ватыкан — асаблівы партнёр у міжнародным дыялогу. У нас склаліся выключнае паразуменне і давер з кіраўнікамі Рымска-каталіцкай царквы і асабіста з Яго Святасцю Папам Рымскім Францыскам», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы разлічвае, што рашэнне ўрада Канады аб адмене абмежаванняў на гандаль з Беларуссю паслужыць наладжванню двухбаковага эканамічнага ўзаемадзеяння і паглыбленню палітычнага дыялогу з гэтай краінай.

Вялікую цікавасць для Беларусі ўяўляе і развіццё адносін з Інданезіяй, асабліва з улікам таго, што эканоміка гэтай краіны з'яўляецца найбуйнейшай сярод дзяржаў АСЕАН. Паводле слоў Прэзідэнта, у апошнія гады таксама прыкметна актывізаваны дыялог Беларусі і Манголіі: адноўленыя кантакты на вышэйшым і высокім узроўнях, пашырана дагаворна-прававая база, узрасла інтэнсіўнасць гандлёва-эканамічных адносін.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што краіна працягвае пошук агульных падыходаў для пашырэння супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі. Ён адзначыў, што Беларусь ужо мае станоўчы досвед кааперацыі з Буркіна-Фасо па пастаўках тэхнічнай прадукцыі. Што датычыцца Эрытрэі, гэта кірунак, дзе яшчэ шмат чаго трэба ажыццявіць.

У час размовы з пасламі пасля цырымоніі ўручэння даверчых грамат Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на намеры Беларусі выбудоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі і інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Кіраўнік нашай дзяржавы таксама звярнуў увагу на велізарную важнасць сумесных намаганняў па захаванні міру і стабільнасці.

# «Лекі» ад зімы

Маладыя медработнікі-стаматолагі з Наваполацка Аляксей і Ірына ТАПАРКОВЫ прыехалі на лецішча абвязаць дрэўцы маладога саду, каб зімой іх не пашкодзілі госці з блізкага лесу — зайцы ды капытныя.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:**

*«Органы выканаўчай улады на месцах стараюцца вырашыць праблемы шматдзетных сем'яў, якія стаяць на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Урадам прынята рашэнне, што крэдытныя рэсурсы ў 2017 годзе будуць перш за ўсё накіроўвацца на гэтыя мэты і ў першачарговым парадку — шматдзетным сем'ям, якія стаяць на ўліку больш за тры гады. Такім чынам, праблема, якая існавала ў мінулым і гэтым гадах, будзе паступова здымацца. Дарэчы, сёлета пры заданні ў 450 кватэр для шматдзетных сем'яў у рэгіёне ўжо пабудавана 1019».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9526 | ▼ |
| Еўра | 2,0765 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0319 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0748 | ▲ |

■ На скрыжаванні думак

# МАЗГАВЫ ШТУРМ ДЛЯ ШКОЛЫ

## Як вырасціць канкурэнтаздольнае пакаленне з маральным стрыжнем?

**«Школьная адукацыя — зброя, больш магутная, чым атамная бомба», — такую думку выказаў падчас пасяджэння клуба «Адкрыты дыялог» першы народны настаўнік Беларусі, выкладчык фізікі з Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя №1 Валерый БАРАШКАЎ. На гэты раз у цэнтры ўвагі ўдзельнікаў дыскусіі аказаліся праблемы школы, выхавання падрастаючага пакалення, павышэння аўтарытэту і прэстыжу прафесіі педагога, роля настаўніка ў лёсе яго выхаванцаў і многія іншыя пытанні.**

Фота БЕЛТА.

### НЕ ПРОСТА «ПРАДМЕТНІК»

— Дробязяў у адукацыі не бывае. Таму любыя змяненні, што адбываюцца ў школе, цягнуць за сабой цэлы шлейф ланцуговых рэакцый, і ў рэшце рэшт усе яны абавязкова адбіваюцца на жыцці кожнага члена грамадства, — упэўнены Валерый Барашкаў. — У школе вельмі шмат змянілася апошнім часам, прычым змянілася ў лепшы бок, але і праблем назапасілася шмат. А праблемы адукацыйныя больш складаныя за любыя тэхнічныя. Раней вельмі часта практыкаваўся мазгавы штурм, калі кожны мог выказаць сваю самую нечаканую, нават вар'яцкую ідэю. А эксперты ўсё аналізавалі і шукалі рацыянальнае зерне. Часам вырашэнне вельмі складанай праблемы вымагала каля 10 тысяч прапаноў, а выбіралася з іх толькі адна...

Рэчаіснасць імкліва мяняецца, і нам даводзіцца з гэтым лічыцца. Мы спрабавалі перайсці на 12-гадовую школу, у нас з'явіліся гімназіі і ліцэі, была ўведзена сістэма цэнтралізаванага тэсціравання... Сёння ўсе робяць спробы разабрацца: што добра, а што дрэнна? Асабіста я лічу, што добры падручнік за год не напішаш, і за пяць гадоў яго не напішаш, бо любы вучэбны дапаможнік павінен пераўтварацца і шліфавацца. У чым я асабіста пераканаў, дык гэта ў тым, што крэйда і дошка яшчэ доўгі час будуць заставацца галоўнымі інструментамі ў вучэбнай дзейнасці на ўроку.

СТАР. 2

■ Добрая нагода

# ГАЛОЎНАЯ СКАРБНІЦА КРАІНЫ

## Нацыянальны гістарычны музей, якім вы яго яшчэ не ведалі

**15 снежня 1956 года быў падпісаны дазвол на «ўтварэнне групы для правядзення падрыхтоўчых работ да адкрыцця Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея». Менавіта гэтая дата традыцыйна лічыцца «днём нараджэння» музея, якому ў бягучым годзе споўнілася ўжо 60 гадоў. Мы даведаліся, чаму прыйшлося разабраць ужо ўсталяваную першую экспазіцыю, навошта лекцыі ладзілі ў цэхах і чым вядомы будынак, у якім месціцца галоўны корпус.**

СТАР. 3

**Да 60-годдзя з дня заснавання ўстановы калектыву Нацыянальнага гістарычнага музея накіраваў віншаванне Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У віншаванні гаворыцца: «Дзякуючы плённай працы некалькіх пакаленняў супрацоўнікаў у музеі сабрана многа артэфактаў, якія прадстаўляюць беларускую нацыю як неад'емную частку сусветнай супольнасці, адлюстроўваюць этапы развіцця краіны, мастацкія набыткі нашага народа, яго звычаі і традыцыі». Таксама кіраўнік дзяржавы адзначыў, што высокай ацэнкі заслугоўвае дзейнасць музея як сацыяльна-культурнага інстытута, скіраваная на выхаванне патрыятызму, вывучэнне і папулярызацыю гістарычнага мінулага Беларусі, у тым ліку за яе межамі.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Антоніу Гутэрыш афіцыйна стаў дзявятым генеральным сакратаром ААН

Цырымонія прынясення прысягі адбылася 12 снежня на пасяджэнні Генасамблеі ААН. Антоніу Гутэрыш даў клятву служыць інтарэсам арганізацыі, а не асобных краін. Гутэрыш прыступіць да выканання абавязкаў генеральнага сакратара ААН 1 студзеня 2017 года. Да гэтага ён быў прэм'ер-міністрам Партугаліі, а таксама доўгі час займаў пасаду вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў.

### У Турцыі затрыманы больш за 200 чалавек па абвінавачанні ў тэрарызме

235 чалавек арыштаваны ў Турцыі па абвінавачанні ў тэрарызме пасля тэракту ў Стамбуле 10 снежня. Пра гэта паведаміла МУС краіны. Аперацыі па барацьбе з тэрарызмам былі праведзены ў 11 правінцыях з мэтай затрымання падазраваных у тэрарыстычнай дзейнасці і прапагандзе тэрарызму ў сацыяльных медыя, гаворыцца ў паведамленні міністэрства. Нагадаем, ахвярамі тэракта ў Стамбуле сталі 44 чалавекі.

### Эйфелева вежа закрыта для турыстаў праз забастоўку

Турыстаў, якія наведваюць горад кахання, чакаюць непрыемныя навіны. Як паведамляюць інфармагенцтвы, галоўная славутасць Парыжа — Эйфелева вежа — закрыта для падарожнікаў праз забастоўку персаналу. Работнікі розных службаў вежы, а гэта каля 300 чалавек, патрабуюць палепшыць умовы працы. Штогод на Эйфелеву вежу падымаюцца больш за 6 млн чалавек.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Названы просты спосаб падаўжэння жыцця

Міжнародная група вучоных прыйшла да высновы, што людзі, якія спажываюць каля 20 грамаў арэхаў у дзень, з меншай імавернасцю захварэюць на рак або памруць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў. Вынікі даследавання публікуе часопіс BMC Medicine. Біёлагі прааналізавалі даныя 29 навуковых работ, прысвечаных уплыву арэхаў і іншых пладоў на здароўе людзей. Да даследаванняў былі прыцягнуты 819 тысяч удзельнікаў. Вучоныя разгледзелі 12 тысяч выпадкаў ішэмічнай хваробы сэрца, 9 тысяч выпадкаў інсульту, 18 тысяч — рака і сардэчна-сасудзістых захворванняў, а таксама больш за 85 тысяч смерцяў. Даследчыкі рэкамендуюць рэгулярна есці арэхі пекан, лясныя і грэцкія арэхі, а таксама плады арахісу. Штодзённае спажыванне 20 грамаў арэхаў звязана з 30-працэнтным скарачэннем верагоднасці захворвання на ішэмію сэрца, зніжэннем рызыкі захварэць на рак на 15 працэнтаў і памяншэннем імавернасці заўчаснай смерці на 22 працэнты.

КАРАТКА

Больш як 25 беларускіх спартсменаў і трэнераў удастоены дзяржаўных узнагарод за дасягненне высокіх вынікаў на I Еўрапейскіх гульнях 2015 года ў Баку, XXXI летніх Алімпійскіх, XV летніх Параалімпійскіх гульнях 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра і значны асабісты ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту.

**Беларусь разлічвае на тое, што станоўчае рашэнне па выдзяленні трэцяга траншу Еўразійскім фондам стабілізацыі і развіцця будзе прынята да канца года, паведаміў міністр фінансаў Беларусі Уладзімір Амарын.**

Збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў запланаваны ў памеры 10,8 тыс. беларусаў.

**Пашыраны спіс кандыдатаў на пасаду новага галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе будзе сфарміраваны да канца года. Падбор кандыдатур будзе ажыццяўляцца па ўсіх магчымых напрамках: як сярод беларускіх спецыялістаў, так і сярод замежных трэнераў.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# ЛЮБЯЧЫ, НЕ АДМАЎЛЯЮЦЦА...

**Новыя людзі, новыя звычкі, стравы, рэчы, захапленні ды іншае прыходзіць у наша жыццё па-рознаму; здараецца — нават не помніш як.**

З чаго і калі пачалося маё знаёмства са «Звяздой», памятаю дакладна. Убачыла ў суседзяў свежы нумар газеты, «зачапілася» ў ім за падборку артыкулаў па прафілактыцы і лячэнні захворванняў натуральнымі сродкамі, узяла пачытаць і... падпісалася.

Трэба сказаць, што да «Звязды» і разам з ёю ў нашу сям'ю прыходзілі іншыя выданні — камсамольскія, партыйныя, савецкія, жаночыя. Яны, як і людзі, з'яўляліся, некаторы час былі ў нашым жыцці, потым без шкадавання знікалі. А «Звязда» заставалася і застаецца — ужо больш як 20 гадоў.

Спытаеце, чаму? Адкажу: па-першае, таму што яна друкуецца на роднай мове, па-другое, таму што менавіта ў ёй (пры ўсім «багацці выбару» — радыё, тэлебачанне, інтэрнэт...) я знаходжу калі не ўсё, то вельмі многае з таго, што мяне цікавіць. Сярод любімых дадаткаў — «Сямейная газета», «Краіна здароўя», «Мясцовае самакіраванне», сярод любімых аўтараў — Валянціна Доўнар, Алена Ляўковіч, Святлана Яскевіч. З задавальненнем чытала пазаштатных звяздоўскіх аўтараў Сяргея Рублеўскага і Таццяну Немчанінаву.

Па-за маёй увагай ніколі не застаецца рубрыка «...Народ на правадзе!» Не буду казаць, што ўсё там вясёлае ды вельмі смешнае, але ж сапраўды жыццёвае, праўдзівае, павучальнае...

Падабаюцца рубрыкі «Хатняя энцыклапедыя» і «Хто каго?»

Добра, што кожны квартал газета разыгрывае каштоўныя прызы (у нас гадоў з дзесяць ідзе звяздоўскі «Віцязь»), добра, што ў пачатку года друкуюцца такія прыгожыя і такія патрэбныя календары...

Ёсць, вядома, і нейкія недахопы... Але на іх, любячы сваю мову і газету, мне здаецца, можна не звяртаць увагі.

**Антаніна МІКАЛАЕВА,** *Рагачоўскі раён.*

***P.S.*** *Вы думаеце прыкладна так? Вы зноў выбіраеце «Звязду» і хочаце расказаць чаму? Калі ласка, пішыце. І, вядома ж, выпісвайце.*

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзеннік

# УСЕ МЫ ІНВЕСТАРЫ. ПАТЭНЦЫЙНЫЯ

## Цяпер свабодныя грошы можна прымусіць папрацаваць

**Учарашняя сесія ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу закранала як фінансавыя, так і сацыяльныя сферы дзяржаўнай палітыкі. Адным з найбольш абмяркоўваемых сярод дэпутатаў законапраектаў стаў дакумент пад назвай «Аб інвестыцыйных фондах».**

### КІРАВАННЕ КАЛЕКТЫЎНЫМ КАПІТАЛАМ

**Валерый БАРАДЗЕНЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах,** у размове з журналістамі адзначыў, што ў нашай дзяржаве ў банкаў існуе пэўная манаполія на інвеставанне. Яны займаюць вельмі вялікую долю на рынку — больш за 95%.

— Дыверсіфікацыя фінансавых рынкаў азначае стварэнне новых інструментаў доўгачасовага інвеставання, — растлумачыў дэпутат. — Законапраект «Аб інвестыцыйных фондах» ствараецца планава, канцэпцыя яго была зацверджана два гады таму Прэзідэнтам. Дакумент рыхтаваўся ў адпаведнасці з грантам Сусветнага банка і пад яго эгідай, ён адпавядае ўсім сусветным нормам, патрабаванням. Што вельмі важна для нас, ён узгоднены з нормамі законаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Казахстан «Аб інвестыцыйных фондах».

У чым сутнасць гэтага закона? Створаныя фонды калектыўнага інвеставання будуць канцэнтраваць сродкі і накіроўваць іх у тыя сферы, якія будуць найбольш даходнымі, перспектыўнымі. Калі звярнуцца да сусветнай практыкі, то самыя перадавыя амерыканскія фонды, якія працуюць ужо некалькі дзясяткаў гадоў, сотню гадоў, маюць сярэднюю гадавую даходнасць прыкладна роўную 20%.

— Гэта вельмі высокая даходнасць, — адзначыў парламентарый. — Безумоўна, калі нашы фонды будуць знаходзіць тыя бізнесы, якія прынясуць такую даходнасць, думаю, гэта будзе вельмі добрай альтэрнатыўнай крыніцай інвеставання для грамадзян, юрыдычных асоб, якія змогуць уваходзіць у гэтыя фонды, ствараць іх і такім чынам атрымліваць даходы на ўкладзены капітал.

### КАРЭКЦІРОЎКА АЛЬТЭРНАТЫЎНАЙ СЛУЖБЫ

Дэпутаты разгледзелі таксама праект закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь», у асноўным прысвечаны карэкціроўцы Закона «Аб альтэрнатыўнай службе», які нядаўна ўступіў у сілу. **Жанна СТАЦІЎКА, член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях,** расказала, што названаму закону патрабуецца яшчэ дапрацоўка — як і іншым нарматыўным актам, якія прама ці ўскосна з ім звязаны.

— Захоўваецца членства ў фермерскіх гаспадарках для грамадзян, што праходзяць альтэрнатыўную службу. Карэктуюцца мерапрыемствы прызыўной камісіі, дапаўняюцца паўнамоцтвы раённай і гарадской прызыўной камісій у дачыненні да грамадзян, якія праходзяць альтэрнатыўную службу. Так, названыя камісіі надзяляюцца правам адмовы ў плане замены воінскай службы на альтэрнатыўную, — пералічыла навацыі дэпутат.

### ПЫТАННІ ДЗЕЯЗДОЛЬНАСЦІ

Два з дзесяці разгледжаных учора законапраектаў прадставіла Пастаянная камісія па заканадаўстве. Гэта праект закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь» і праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь». **Максім МІСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве,** паведаміў журналістам: тыя нормы, якія будуць удасканальвацца ў Грамадзянскім кодэксе, кодэксе «Аб шлюбе і сям'і», другіх законах, будуць накіраваны не на абмежаванне, а на паляпшэнне становішча грамадзян.

— У прыватнасці, будуць разглядацца пытанні аб прызнанні пэўнай катэгорыі грамадзян недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі, — расказаў Максім Міська. — Навіной тут будзе тое, што людзі, якія ў сувязі з захворваннямі знаходзяцца ў несвядомасці, будуць прызнавацца недзеяздольнымі. У гэтай сувязі ім будзе назначана апека, а гэта паляпшэнне іх правоў у сувязі з атрыманнем пенсіі, грашовай дапамогі.

Калі казаць пра кодэкс «Аб шлюбе і сям'і», то будзе пашыраны шэраг грамадзян, якія будуць вызваляцца ад кампенсацыі затрат дзяржавы на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні.

— Цяпер гэта недзеяздольныя грамадзяне, грамадзяне з пэўнымі захворваннямі, — пералічыў парламентарый. — Спіс гэтых захворванняў зацвярджаецца Міністэрствам аховы здароўя. Новым праектам закона прадугледжваецца вызваленне ад кампенсацыі інвалідаў першай і другой групы цалкам. Па аналогіі з тым, як інваліды першай і другой групы вызвалены цалкам або часткова ад выплаты аліментаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Ёсць праблема — ёсць рашэнне

# Як дзіцяці-інваліду трапіць у рэзідэнцыю Дзеда Мароза?

## Галоўнае — як яму туды даехаць

**Некалькі гадоў таму Міністэрства замежных спраў Германіі звярнулася ў Беларусь з запытам, наколькі ў краіне даступная турыстычная інфраструктура для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У нас такіх звестак не аказалася. Тады Германія абвясціла нас не рэкамендаванай краінай для наведвання асобамі, якія маюць тыя ці іншыя абмежаванні.**

Па сутнасці, яна ўнесла Беларусь у чорны спіс інклюзіўнага турызму. Турыстычныя кампаніі і страхаўшчыкі прынялі гэта да ведама. Нямецкія турысты, напрыклад, не прыязджаюць у нашы санаторыі, таму што іх страхавыя фірмы адмаўляюцца ў гэтым выпадку страхаваць іх, указваючы на недастатковую даступнасць і камфортнасць нашых санаторыяў і гасцініц для асоб з абмежаваннямі.

**Для чалавека, які нядаўна перанёс інфаркт, вельмі важна, каб кожныя 150 метраў ён мог знайсці месца, дзе можна прысесці. А цяпер гляньце на нашы паркі: ці шмат у іх лавак?**

— Між тым у свеце даступны турызм (accessible tourism) або, як мы гаворым, інклюзіўны турызм (таму што даступным турызмам часта называюць малабюджэтныя туры) — гэта сегмент турыстычнага рынку, які найбольш дынамічна развіваецца, — кажа **выкладчык кафедры турызму факультэта міжнародных адносін БДУ Наталля БАРЫСЕНКА-КЛЕПАЧ.** — У Еўропе і ЗША ён ужо складае 11% усіх турыстычных патокаў, і плануецца, што да 2020 года безбар'ерны турызм будзе складаць 22% ад усяго турызму.

У свеце налічваецца каля 785 мільёнаў чалавек з інваліднасцю — гэта каля 15% насельніцтва планеты. Калі ўлічваць членаў іх сем'яў, то можна сказаць, што больш за 2 млрд людзей непасрэдна сутыкаюцца з акрэсленай праблемай. А гэта ўжо ні многа ні мала траціна насельніцтва Зямлі. Калі ўлічваць, што турысты з інваліднасцю звычайна ездзяць з кампаньёнамі і аддаюць перавагу падарожжам у так званы «нізкі сезон», становіцца зразумелым, што гэта робіць іх вельмі прывабнымі для турыстычнай галіны. Таму тыя, хто развівае безбар'ерны, інклюзіўны турызм, зыходзяць не толькі з меркаванняў гуманнасці, але і ў немалой ступені — з эканамічных меркаванняў.

* * *

Большасць беларусаў, думаючы пра бар'еры, уяўляюць сабе ў першую чаргу бардзюры, лесвіцы, прыступкі. Але такімі простымі рэчамі бар'еры не абмяжоўваюцца.

— Мы не бачым на нашых вуліцах інвалідаў не толькі таму, што пандусаў не хапае, — тлумачыць **каардынатар праектаў «Офіса па правах людзей з інваліднасцю» Сяргей ДРАЗДОЎСКІ.** — Мы сёння выбудоўваем даступнае асяроддзе для досыць вузкай катэгорыі людзей з парушанай мабільнасцю. Але недастаткова яшчэ думаем пра тое, што гэтае безбар'ернае асяроддзе павінна распаўсюджвацца і на людзей пажылога ўзросту, і на грамадзян з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі (дарэчы, гэта самая частая прычына інваліднасці) і г.д.

Для чалавека, які нядаўна перанёс інфаркт, вельмі важна, каб кожныя 150 метраў ён мог знайсці месца, дзе можна прысесці. А цяпер гляньце на нашы паркі: ці шмат у іх лавак? Тут гаворка не пра тое, каб проста прысесці і паназіраць за навакольлем, а пра тое, што хворы чалавек, для якога крытычна важна адпачыць, каб разгрузіць сваё сэрца, у гэты парк проста не пойдзе.

Але часам здараецца так, што мы нават не ведаем таго, што ў нас сёння ўжо зроблена для людзей з інваліднасцю. Сяргей Драздоўскі прыводзіць красамоўны прыклад: «У Брэсцкай крэпасці, цалкам якасна з пункту гледжання даступнасці, пабудаваны рэстаран. Мы запыталіся ў персанала: а дзе ў вас даступны для інваліда туалет? І нам адказалі: у нас няма такога. Мы не паверылі і ў рэшце рэшт, прыклаўшы намаганні, знайшлі такі туалет. Ён быў у тым рэстаране, але персанал пра гэта не ведаў!»

Наогул, у ідэале для развіцця інклюзіўнага турызму павінен быць даступным увесь ланцужок турыстычных паслуг, які ўключае ў сябе безбар'ернае асяроддзе, даступнасць транспарту і інфармацыі. Каб з сайтамі турыстычных кампаній, гасцініц і тураб'ектаў, у тым ліку транспартнага сектара, маглі азнаёміцца сляпыя карыстальнікі ды людзі са слабым зрокам. Для падарожнікаў з асаблівымі патрэбамі павінны быць даступныя грамадскія ўстановы, аб'екты культуры, архітэктурныя і гістарычныя помнікі, музеі, тэатры.

* * *

Прадстаўнікі беларускага турбізнесу сцвярджаюць, што самае складанае пытанне ў нас у краіне — з транспартнай даступнасцю. Няма экскурсійных аўтобусаў, якія мелі б спецыяльныя платформы. Белавежская пушча ўжо даступная для людзей з асаблівымі патрэбамі, рэзідэнцыя Дзеда Мароза — таксама, але як давезці туды дзетак-інвалідаў? Некалькі разоў турфірмы бралі валанцёраў, якія дапамагалі занесці дзяцей з інваліднасцю ў звычайны аўтобус.

У іншых краінах у такіх выпадках карыстаюцца адмысловымі аўтобусамі, абсталяванымі з улікам патрэб людзей з інваліднасцю, якія, дарэчы, з'яўляюцца шматфункцыянальнымі. Там здымныя сядзенні, і такі аўтобус можна выкарыстоўваць і для звычайных людзей, а калі едзе калясачнік, можна зняць два сядзенні і вызваліць месца для яго. Праўда, наш Мінтранс, па словах прадстаўнікоў турфірмаў, на іх просьбы аб закупцы такіх аўтобусаў пакуль адмоўчваецца.

— Усё адразу прыстасаваць да патрэб людзей з інваліднасцю немагчыма, таму трэба зыходзіць з прынцыпу разумнага прыстасавання, — кажа Сяргей Драздоўскі. — Калі для маленькай крамы занадта дорага пабудаваць вялікі пандус, можна паставіць кнопку выкліку. І гэта нармальна. Але як ацаніць сітуацыю, калі кнопка выкліку знаходзіцца ў аптэцы, і пры гэтым ёсць правіла аб тым, што забаронены вынас за дзверы прэпаратаў, якія прадаюцца па рэцэпце? Гэта значыць, чалавек можа выклікаць фармацэўта — і ўсё. Прэпарат яму ніхто не вынесе. Ці стала гэтая аптэка даступнай? Не.

* * *

Даступнае асяроддзе вельмі дапамагло б не толькі людзям з інваліднасцю. У падарожжах (ды і не толькі) да ліку найбольш уразлівых груп, тых, каму патрэбны адмысловая даступнасць і камфорт, можна прылічыць і пажылых людзей, і сем'і з маленькімі дзецьмі, што едуць з калясамі і мноствам сумак і рэчаў, і людзей вялікага памеру, а таксама вельмі высокіх або нізкіх, якім можа быць складана скарыстацца ў паездцы тэрміналамі або банкаматамі, і вандроўнікаў з вялікім багажом, і нават тых, хто не ведае англійскай мовы. Гэта значыць — амаль кожнага турыста.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# АСНОВА ГАНДЛЮ

## Транспартныя сувязі з краінамі Еўропы павінны развівацца

**У наступным годзе Беларусь будзе старшынстваваць у Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятыве (ЦЕІ). Пра тое, якія асноўныя кірункі працы плануе здзейсніць у гэтым рэчышчы наша краіна, на пасяджэнні кіраўнікоў урадаў краін — удзельніц ЦЕІ, што адбылося ў Сараеве, паведаміў прэм'ер-міністр нашай дзяржавы Андрэй КАБЯКОЎ.**

Кіраўнік беларускага ўрада заявіў, што падчас свайго старшынства ў 2017 годзе Беларусь прыкладзе ўсе намаганні для ўмацавання ролі аб'яднання ў інтэграцыйных працэсах у Еўропе. «Беларусь перакананая ў значнасці і запатрабаванасці Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы для нашых краін і нашых грамадзян. У гэтай сувязі мы нацэлены і гатовыя ўнесці свой уклад у сумесныя намаганні па яе развіцці», — адзначыў ён. Старшынства ў ЦЕІ не толькі адкрывае дадатковыя магчымасці для ўключэння Беларусі ў еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы, але таксама будзе спрыяць геаграфічна больш збалансаванаму падыходу ў дзейнасці арганізацыі, упэўнены прэм'ер.

На думку Андрэя Кабякова, ЦЕІ павінна працягваць выступаць у якасці сувязнага звяна паміж рознымі інтэграцыйнымі платформамі і субрэгіёнамі, якія гістарычна склаліся ў Еўропе. Сёння яна злучае краіны Еўрапейскага саюза, Заходніх Балкан і Усходняй Еўропы на аснове ідэі аб'яднанай, мірнай і моцнай Еўропы. Для ЦЕІ ў адносінах да Еўрапейскага саюза важна заставацца асноўным партнёрам па прасоўванні больш шырокай еўрапейскай інтэграцыі, паведамляе прэс-служба Саўміна. Перш за ўсё, гаворка ідзе аб стабілізацыі рэгіёна праз эканамічнае развіццё, стварэнне новых пунктаў росту, забеспячэнне больш шырокай інфраструктурнай злучальнасці і мабільнасці. Гэта таксама можа адыграць важную ролю ва ўмацаванні «ўсходняга вымярэння» ў дзейнасці арганізацыі.

Акрамя таго, Андрэй Кабякоў выказаў намер «адрасна папрацаваць над развіццём лагістычнай інфраструктуры як ключавым фактарам гандлю, эканамічнага росту і стабільнасці».

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што Беларусь адкрыта да ўсебаковага і канструктыўнага супрацоўніцтва з усімі васемнаццаццю краінамі ЦЕІ.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# МАЗГАВЫ ШТУРМ ДЛЯ ШКОЛЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У Беларусі шмат таленавітых маладых людзей — сапраўдных самародкаў. Але менавіта ад настаўніка залежыць, ці заўважаць іх, ці накіруюць, якія каштоўнасці ў іх сфарміруюць, — падзяліўся сваімі думкамі **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэй БЕЛЯКОЎ.** — Сімвалічна, што пасяджэнне нашага дыскусійнага клуба супала са святкаваннем 125-годдзя Максіма Багдановіча. Гэта самародак зямлі беларускай, які пражыў зусім нядоўгае жыццё, але пакінуў вельмі яркі след у культуры і літаратуры сваёй бацькаўшчыны. Па сутнасці, ён з'яўляецца для моладзі прыкладам таго, як трэба выхоўваць асобу.

**«Мы павінны выхаваць у падрастаючага пакалення пачуццё гонару за сваю краіну, вырасціць новага чалавека. А для гэтага патрабуюцца новыя падыходы».**

У грамадстве актыўна вядуцца дыскусіі на тэму, ці павінна школа займацца гэтым самым выхаваннем? Можа быць, яе галоўная функцыя — навучаць, а ўсім астатнім няхай займаецца сям'я?

На думку Валерыя Барашкава, навучанне і выхаванне — дзве нераздзельныя функцыі школы. І кожны настаўнік — не проста прадметнік, але яшчэ і выхавальнік, які штодня на сваіх уроках выхоўвае вучняў, у тым ліку і сваім прыкладам. Выхаванне можа быць школьным, сямейным, рэлігійным, а можа быць і вулічным...

### ШТО МЫ ЎПУСКАЕМ?

**Протаіерэй, клірык мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора, старшы выкладчык астраномii БДПУ Аляксандр ШЫМБАЛЁЎ** звяртае ўвагу на цэлы клубок супярэчнасцяў у пытаннях выхавання:

— Школа лічыць, што выхоўваць павінна сям'я, а сям'я адрасуе гэту функцыю школе. У выніку дзіця недаатрымлівае ні там, ні там, асабліва ўлічваючы хранічную занятасць сучасных бацькоў і захопленасць падрастаючага пакалення інтэрнэт-тэхналогіямі. Школа павінна найперш даваць дзецям этычнае і эстэтычнае выхаванне, бо сёння мы сутыкаемся з тым, што моладзь не ведае элементарных правілаў прыстойнасці. А вось займацца духоўным выхаваннем у школах больш праблематычна, бо духоўныя пытанні вельмі далікатныя і няпростыя, таму галоўную ролю тут павінна адыгрываць усё ж сям'я. Сто гадоў таму бацькі забяспечвалі і духоўнае, і працоўнае выхаванне і цудоўна з гэтым спраўляліся. А цяперашняя моладзь не мае ніякага ўяўлення пра фізічную працу, ад якой яе ўсяляк «абараняюць», у выніку вырастаюць не прыстасаваныя да жыцця людзі. Праблема яшчэ і ў тым, што многія сем'і былі адарваныя ад духоўных традыцый выхавання... Савецкая школа павінна была выхаваць чалавека для савецкага грамадства, а гэта крыху іншая задача... Таму сёння сям'я плюс школа павінны разам забяспечваць комплекснае развіццё асобы і, канешне, школе трэба ўлічваць дэфіцыт сямейнага выхавання...

Як трапна заўважыў яшчэ адзін удзельнік дыскусійнага клуба, **старшыня назіральнага савета Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» Вадзім БАРАВІК,** калі дрэнна працуе школа, то даводзіцца шмат працаваць міліцыі.

— Духоўнасць, патрыятызм — усё гэта важна, але мы павінны выхоўваць эфектыўных людзей. Самае галоўнае — гэта наша канкурэнтаздольнасць на рынку, — падкрэсліў ён. — Калі казаць пра адукацыйныя дасягненні беларусаў, то яны прызнаюцца не толькі на ўзроўні СНД. Паводле індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь мае высокі рэйтынг у свеце. Але ёсць праблемы, на якія нельга закрываць вочы. Давайце паглядзім, што адбываецца ў нашай эканоміцы. Ці ўсе работнікі якасна выконваюць свае задачы? А, можа, яны сядзяць і чакаюць абеду ці канца працоўнага дня? Думаю, што большасць з іх чакае... Выпуск няякаснай прадукцыі, нашы брудныя пад'езды (філасофія «ўсё, што знаходзіцца за маімі дзвярыма, мяне не хвалюе») — сведчанне таго, што ў школе не навучылі правільнаму стаўленню да ўласнасці. Дык што ж мы ўпускаем? Чаму трэба вучыць выпускнікоў? Чаму наша моладзь так імкнецца за мяжу? Чаму гатовы ехаць кагосьці абслугоўваць, пагаджаюцца на непрэстыжную працу? Адкуль у нас такі комплекс непаўнацэннасці?

Магутную Германію пабудавалі немцы, а эканамічна развітую Японію — японцы. Гэта іх дасягненні! Чаму Сінгапур з колькасцю насельніцтва 5 мільёнаў чалавек мае адзін з самых высокіх паказчыкаў валавога ўнутранага прадукту на душу насельніцтва? Па-першае, мы павінны выхаваць у падрастаючага пакалення пачуццё гонару за сваю краіну, вырасціць новага чалавека. А для гэтага патрабуюцца новыя падыходы — тыя, што дзейнічаюць у сістэме адукацыі зараз, даўно састарэлі. Маладыя людзі павінны разумець, што мы будуем сваю краіну для сябе, усё ў нашых руках і ў нашых сілах.

**Ідэя стварэння пастаяннага дзеючага клуба «Адкрыты дыялог» упершыню была агучана Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі ў жніўні бягучага года на рэспубліканскім спартыўна-адукацыйным форуме «Алімпія» падчас правядзення адкрытага дыялогу «Моладзь і палітыка: формула адказнасці». А першае пасяджэнне клуба адбылося ў пачатку верасня ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці.**

### ДАЙСЦІ ДА ДУШЫ І СВЯДОМАСЦІ

— Адукацыя — гэта тое, што засталося пасля таго, як усё вывучанае ў школе забылася. Усім вядома гэта выказванне Альберта Эйнштэйна. Але што застаецца, калі ўсё вывучанае забытае? Не веданне формул, правілаў арфаграфіі, сямействаў раслін, а спосабы дзейнасці, з дапамогай якіх гэтыя формулы выводзіліся, уменне ўзаемадзейнічаць у парах і групах, уменне аналізаваць і абагульняць, — дзеліцца сваімі думкамі **начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.** — У нашай памяці застаецца незабыўная атмасфера на ўроках. І да каго на сустрэчах выпускнікоў мы ляцім як на крылах? Да таго настаўніка, які пакінуў след у нашым жыцці. Але настаўнікі бываюць розныя, гэта не сакрэт. Дайсці да душы і свядомасці кожнага дзіцяці — гэта майстэрства і вялікая праца. Усё ж такі асоба настаўніка мае выключнае значэнне ў выхаванні. Сёння мы шмат увагі ўдзяляем выхаваўчаму патэнцыялу ўрока. Таму адным з мерапрыемстваў рэспубліканская конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» было прадстаўленне ўласнага вопыту педагагічнай дзейнасці «Навучаючы, выхоўваю...» А ў рамках дзейнасці клуба «Хрустальны журавель», які аб'ядноўвае ўдзельнікаў і арганізатараў конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь», на працягу двух гадоў вялася работа па даследаванні выхаваўчых магчымасцяў вучэбных прадметаў і іх рэалізацыі на школьных занятках. Мая пазіцыя адназначная: адукацыя — гэта навучанне плюс выхаванне.

Першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй Белякоў лічыць, што такую форму работы, як арганізацыя дыскусійных пляцовак, можна было б зрабіць факультатывам у школе.

— Школьнікі павінны ўмець бачыць і разглядаць любую праблему з усіх бакоў. Не проста мець сваю пазіцыю, але разумна яе адстойваць, рабіць гэта аргументавана. Палеміка — гэта мастацтва, якім валодаюць нямногія, — падкрэсліў ён.

— Будучыня нашай краіны залежыць ад школы. Адукацыя — гэта люстэрка грамадства, — падсумаваў Андрэй Белякоў. — І калі грамадства сёння надзвычай прагматычнае, жыве выключна матэрыяльнымі каштоўнасцямі, тое ж мы назіраем і ў школе. Але жыць толькі матэрыяльнымі каштоўнасцямі і забываць пра душу — недаравальна. Невыпадкова школа заўсёды лічылася духоўнай калыскай народа.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### АБАРОТ НАРКОТЫКАЎ ІДЗЕ НА СПАД,

а на сяле галоўная праблема — крадзяжы

**Пра гэта ішла гаворка на пасяджэнні калегіі МУС.**

За апошнія тры гады дзяржаўная палітыка ў сферы наркакантролю стала больш жорсткай і, дзякуючы гэтаму, больш эфектыўнай. Удалося прадухіліць масавае захапленне забароненымі рэчывамі сярод моладзі. Аб станоўчых выніках найбольш красамоўна кажа статыстыка. Як паведамляе прэс-служба МУС, за 10 месяцаў 2014 года было зарэгістравана 1092 выпадкі перадазіроўкі наркотыкамі, а за аналагічны перыяд гэтага года — 658. Акрамя таго, за апошнія два гады не было зафіксавана ні аднаго падобнага факта сярод непаўналетніх.

Сёлета супрацоўнікамі органаў унутраных спраў выяўлена амаль 5,5 тысячы нарказлачынстваў. Пераважная большасць з іх ажыццяўляецца праз глабальную сетку. У ходзе праверак была спынена дзейнасць 90 інтэрнэт-крам, якія прапаноўвалі пакупнікам забаронены тавар, а таксама заблакіравана амаль паўтысячы электронных кашалькоў, звязаных з гэтым бізнесам. На працягу года з незаконнага абароту канфіскавана 329,8 кг наркатычных сродкаў і 29,3 кг псіхатропных рэчываў, а таксама 21 т насення маку і 1,5 т насваю.

Калі гаварыць пра злачыннасць на вёсцы, варта адзначыць, што больш за палову ўсіх крымінальна каральных дзеянняў склалі крадзяжы. Аднак іх колькасць, таксама як і лік фактаў наўмыснага прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў, рабаванняў і разбояў, у цэлым зменшылася. Пры гэтым назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці махлярстваў і хуліганстваў, таму асаблівую ўвагу неабходна надаць дэалкагалізацыі насельніцтва, а таксама ахове пажылых людзей, якія аўтаматычна трапляюць у групу рызыкі.

У вёсках і аграгарадках актыўна праводзяцца прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на падтрыманне грамадскага парадку. Гэта дало магчымасць у бягучым годзе амаль на 5% знізіць колькасць зарэгістраваных злачынстваў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

### ЛІЧЫЛЬНІКІ НА БАТАРЭІ ПАСТАВЯЦЬ І Ў СТАРЫЯ ДАМЫ

**Аб гэтым паведаміў <u>намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі — дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці Міхаіл МАЛАШАНКА</u> на міжнароднай навукова-тэхнічнай канферэнцыі «Энергаэфектыўныя будынкі XXI стагоддзя».**

У прыватнасці, ён адзначыў, што за пяцігодку (2016—2020 гады) будуць распрацаваны асноўныя нарматыўна-прававыя акты, якія забароняць будаўніцтва жылога фонду без індывідуальных прыбораў уліку цеплавой энергіі з дыстанцыйнай перадачай даных. Таксама плануецца, што ўжо з 2017 года краіна пяройдзе на абавязковы разлік па індывідуальных прыборах уліку за цеплавую энергію там, дзе гэтыя прыборы ўстаноўлены.

«Акрамя таго, цяпер распрацоўваецца праграма забеспячэння індывідуальнымі прыборамі ўліку цеплавой энергіі тых дамоў жыллёвага фонду, дзе ўсё сёння няма», — сказаў Міхаіл Малашанка. Паводле яго слоў, у жыллёвым сектары ёсць велізарныя рэзервы для зніжэння энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту і замяшчэння імпартаваных відаў паліва. Жыллёвы фонд Беларусі вало-

дае значным патэнцыялам у сферы энергазберажэння і скарачэння выкідаў парніковых газаў. У сектары ЖКГ выкарыстоўваецца каля 38% паліўна-энергетычных рэсурсаў, якія спажывае краіна ў цэлым. Улічваючы ўзрастаючую ролю эканоміі цеплавой і электрычнай энергіі, вялікае значэнне варта надаваць будаўніцтву энергаэфектыўнага жылля, асабліва класаў энергаэфектыўнасці дамоў А і А+, лічыць дырэктар дэпартамента.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

### АДНАВІЛІ ПРАЦОЎНЫ СТАЖ

**Яшчэ адзін прыклад таго, як прафсаюзы абараняюць інтарэсы грамадзян.**

Чатыры гады таму цялятніца адной з аграсядадарак Горацкага раёна з 20-гадовым стажам вымушана была звольніцца, каб даглядаць мужа пасля інсульту — таксама былога работніка гэтага прадпрыемства. Урэшце мужу далі першую групу інваліднасці, а жанчына зноў вярнулася ў гаспадарку. Але яе стаж абнуліўся, і гэта сур'ёзна паўплывала на заробак. Для сям'і, дзе выхоўваецца непаўналетняе дзіця, такі паварот спраў быў адчувальным ударам.

— Гэта падштурхнула жанчыну звярнуцца да нас, — паведамілі ў прэс-службе Федэрацыі прафсаюзаў па Магілёўскай вобласці. — Галоўны прававы інспектар Магілёўскага абласнога Савета Белхімпрафсаюза Мікалай Фяськоў растлумачыў ёй, што асноўныя нормы наліченне працоўнага стажу і аплаты працы павінны быць прапісаны ў калектыўным дагаворы арганізацыі. Каб дапамагчы заяўніцы, да справы далучыліся старшыня прафкама сельгаспрадпрыемства і старшыня раённага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў АПК. Пасля хадайніцтва перад кіраўніцтвам прадпрыемства работніцы пайшлі насустрач. На падставе заявы жанчыне аднавілі працоўны стаж і налічылі 20-працэнтную надбаўку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


**Извещение о проведении 27 декабря 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. (бел. руб. образца 2000 года) | Размер задатка, бел. руб. (бел. руб. образца 2000 года) |
| 1. | зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220623 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 12 296,78 (122 967 800) | 1 220,00 (12 200 000) |
| 2. | зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1985 | 4226647 | | 12 450,40 (124 504 000) | 1 245,00 (12 450 000) |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

ДЭПАРТАМЕНТ ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
09 лістапада 2016
Прозвішча Сушко С.А.
Подпіс

белагропромбанк (25 лет)

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об эмиссии облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для физических лиц двести шестнадцатого, двести семнадцатого выпусков

**1. Наименование эмитента:**

а) полное наименование:

на белорусском языке – адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк»;

на русском языке – открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – Банк);

б) сокращенное наименование:

на белорусском языке – ААТ «Белаграпрамбанк»;

на русском языке – ОАО «Белагропромбанк».

**2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 229 63 25, факс (017) 229 64 41.
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

**3. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии облигаций и сроки их публикации**

Годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка будет ежегодно публиковаться в газетах «Звязда» или «Рэспубліка» в сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

В газете «Звязда» публикуется следующая информация:

- в случае принятия решения о реорганизации или ликвидации Банка – не позднее 2-х месяцев с момента принятия такого решения;

- в случае возбуждения в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) — в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;

- в случае внесения изменений в проспект эмиссии облигаций – не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

Кроме того, вышеуказанная отчетность и информация будет размещена на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг в сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

**4. Размер уставного фонда Банка**

Уставный фонд Банка составляет 810 363 504,60 белорусских рублей (Восемьсот десять миллионов триста шестьдесят три тысячи пятьсот четыре белорусских рубля, 60 копеек).

**5. Права владельца и обязанности Банка, удостоверяемые облигацией**

Облигация предоставляет ее владельцу равные объем и сроки осуществления прав вне зависимости от времени приобретения облигации.

Владелец облигации имеет право:

- получать доход по облигации в соответствии с условиями, предусмотренными подпунктом 6.10 пункта 6 настоящего документа;

- получать номинальную стоимость облигации при ее погашении в порядке, предусмотренном подпунктом 6.12 пункта 6 настоящего документа;

- получать номинальную стоимость облигации с выплатой дохода при досрочном погашении облигации, а также в случае признания эмиссии недобросовестной, а выпуска недействительным в порядке, предусмотренном соответственно подпунктами 6.11 и 6.14 пункта 6 настоящего документа;

- свободно распоряжаться облигацией в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Банк обязан:

- выплачивать доход по облигации в порядке и на условиях, предусмотренных подпунктом 6.10 пункта 6 настоящего документа;

- погасить облигацию в порядке, предусмотренном подпунктом 6.12 пункта 6 настоящего документа;

- досрочно погасить облигацию в порядке, предусмотренном подпунктом 6.11 пункта 6 настоящего документа;

- обеспечить владельцам облигаций возврат денежных средств, полученных в оплату размещенных облигаций, а также причитающийся процентный доход в случае признания эмиссии недобросовестной, а выпуска недействительным в порядке, предусмотренном подпунктом 6.14 пункта 6 настоящего документа.

**6. Сведения о проведении открытой продажи облигаций двести шестнадцатого, двести семнадцатого выпусков**

**6.1. Дата принятия и утверждения решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего (утвердившего) это решение**

Решение о двести шестнадцатом, двести семнадцатом выпусках облигаций на предъявителя для физических лиц в соответствии с Уставом Банка принято и утверждено Наблюдательным советом Банка 14.10.2016, протокол № 21.

**6.2. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Эмиссия облигаций осуществляется по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что объем выпусков таких облигаций не превышает размера нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).

По состоянию на 01.09.2016 нормативный капитал Банка составляет 1 136 145,5 тыс. бел. рублей.

**6.3. Цель эмиссии облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций**

Эмиссия облигаций двести шестнадцатого, двести семнадцатого выпусков осуществляется в целях привлечения денежных средств физических лиц.

Привлеченные средства от размещения облигаций будут направлены на пополнение ресурсной базы Банка.

**6.4. Эмиссия облигаций согласована Национальным банком Республики Беларусь** (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 21.10.2016 № 545).

**6.5. Форма и вид облигаций, объем выпуска, количество, номинальная стоимость облигаций, ставка процентного дохода:**

| Номер выпуска | 216 | 217 |
|---|---|---|
| Валюта выпуска | доллар США | доллар США |
| Форма и вид облигации | документарные, на предъявителя, процентные, неконвертируемые | |
| Объем выпуска, млн. денежных единиц | 25,0 | 25,0 |
| Количество облигаций (шт.) | 25 000 | 5 000 |
| Номинальная стоимость | 1 000 | 5 000 |
| Ставка процентного дохода, процентов годовых | 4,0 | 4,0 |

**6.6. Период проведения открытой продажи облигаций**

Дата начала периода размещения облигаций – 26.12.2016, дата окончания периода размещения облигаций – 18.06.2018.

В период размещения облигаций Банк вправе принять решение об изменении даты окончания открытой продажи облигаций.

**6.7. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь эмиссии облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, а также публикации в периодическом печатном издании и размещении на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг краткой информации об эмиссии облигаций Банка.

Размещение облигаций осуществляется путем открытой продажи в филиалах, расчетно-кассовых центрах, а также структурных подразделениях центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.

Владельцами облигаций могут быть только физические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, приобретающие их не в целях предпринимательской деятельности.

Облигации продаются по их номинальной стоимости в валюте номинала. В оплату облигаций физические лица обязаны внести денежные средства наличными либо перечислить в Банк в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Банк вправе не осуществлять продажу облигаций в период размещения, если условия, определенные решениями о выпусках облигаций, становятся для Банка экономически невыгодными. Решение о приостановке (продолжении) продажи двести шестнадцатого, двести семнадцатого выпусков облигаций в период размещения принимает уполномоченный орган Банка.

**6.8. Срок и порядок обращения облигаций**

Обращение облигаций осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Срок обращения облигаций – 750 календарных дней с 26.12.2016 по 15.01.2019. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

**6.9. Дата начала погашения облигаций** – 15.01.2019.

**6.10. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода**

Доход по облигации выплачивается, начиная с установленной в нижеследующей таблице даты начала выплаты дохода за соответствующий период начисления, при условии предъявления физическим лицом оригинала облигации в Банк.

| ПЕРИОДЫ НАЧИСЛЕНИЯ ПРОЦЕНТНОГО ДОХОДА | | | |
|---|---|---|---|
| Порядковый номер периода начисления дохода | Начало периода | Конец периода, **дата начала выплаты дохода** | Продолжительность периода (дней) |
| 1 | 27.12.2016 | 15.07.2017 | 201 |
| 2 | 16.07.2017 | 15.01.2018 | 184 |
| 3 | 16.01.2018 | 15.07.2018 | 181 |
| 4 | 16.07.2018 | 15.01.2019 | 184 |
| ИТОГО: | x | x | 750 |

Начисление процентного дохода осуществляется со дня, следующего за днем размещения соответствующей облигации, по 15.01.2019 включительно (за исключением случая предъявления облигации к досрочному погашению). С 16.01.2019 процентный доход не начисляется.

Процентный доход по облигации начисляется с даты, следующей за датой ее продажи Банком, по дату начала выплаты процентного дохода за период начисления дохода, в котором была продана облигация, включительно. Процентный доход за последующие периоды начисления (включая последний) начисляется с даты, следующей за датой начала выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода, по дату начала выплаты процентного дохода за соответствующий период начисления дохода (дату начала погашения – 15.01.2019) включительно.

В случае предъявления облигации к досрочному погашению на условиях, изложенных в подпункте 6.11 пункта 6 настоящего документа, сумма процентного дохода рассчитывается с даты, следующей за датой продажи (датой выплаты последнего процентного дохода) по дату ее досрочного погашения включительно.

Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Д = \frac{Нп \times Пп}{100} \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$

где:

Д – процентный доход по процентной облигации, выплачиваемый периодически в течение срока ее обращения;

Нп – номинальная стоимость облигации;

Пп – ставка дохода в размере 4,0 (Четыре) процента годовых за период начисления дохода;

Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

День размещения облигации и дата выплаты процентного дохода за период начисления дохода, в котором была продана облигация, считаются одним днем. Дата выплаты дохода за предшествующий период начисления процентного дохода и дата выплаты дохода за текущий период начисления дохода (дата погашения, дата досрочного погашения) считаются одним днем.

Выплата процентного дохода по облигациям осуществляется за соответствующий период начисления филиалами, расчетно-кассовыми центрами, а также структурными подразделениями центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени. В случае если дата начала выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется, начиная с первого рабочего дня, следующего за нерабочим днем. При этом проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящем документе понимаются выходные дни, государственные праздники, праздничные дни и другие, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Выплата процентного дохода по облигациям осуществляется в валюте номинала наличными денежными средствами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**6.11. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

Владельцы облигаций могут предъявить их к досрочному погашению при предъявлении оригинала облигации по истечении 365 календарных дней после даты приобретения у Банка.

При досрочном погашении владельцу выплачивается номинальная стоимость облигации и процентный доход по дату досрочного погашения облигации включительно в денежных единицах, в которых выражена ее номинальная стоимость, наличными денежными средствами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**6.12. Порядок погашения облигаций**

Погашение облигаций осуществляется Банком, начиная с 15.01.2019, в отношении лиц, предъявивших оригиналы этих облигаций к погашению, независимо от сроков обращения собственника или иного законного владельца облигаций.

При погашении облигаций предъявителю облигации – физическому лицу выплачиваются номинальная стоимость облигации, а также все неполученные доходы наличными денежными средствами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**6.13. Информация о порядке конвертации облигаций данного выпуска в облигации другого выпуска с более поздней датой погашения**

Банком не предусматривается конвертация облигаций двести шестнадцатого, двести семнадцатого выпусков в облигации других выпусков с более поздней датой погашения.

**6.14. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании эмиссии облигаций несостоявшейся, признании эмиссии недобросовестной, а выпуска облигаций недействительным, приостановлении или запрещении эмиссии облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь**

Банком не предусматривается возможность признания эмиссии облигаций несостоявшейся.

В случае признания эмиссии недобросовестной, а выпуска(-ов) облигаций недействительным(-ми), приостановлении или запрещении эмиссии облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, все облигации двести шестнадцатого и (или) двести семнадцатого выпуска(-ов) подлежат изъятию из обращения, а средства, полученные Банком от размещения выпуска(-ов) облигаций, в том числе причитающийся процентный доход по таким облигациям за период с даты, следующей за датой продажи (датой выплаты последнего процентного дохода) по дату признания выпуска(-ов) облигаций недействительным(-ми), в месячный срок с даты признания выпуска(-ов) недействительным(-ми) возвращаются инвесторам.

Денежные средства возвращаются независимо от сроков обращения собственника или иного законного владельца облигаций в Банк.

**6.15. Дата и государственный регистрационный номер выпуска облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 09 ноября 2016 г.

Государственный регистрационный номер:
двести шестнадцатого выпуска: 5-200-02-2814;
двести семнадцатого выпуска: 5-200-02-2815.

**7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)**

С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций двести шестнадцатого, двести семнадцатого выпусков) можно ознакомиться в филиалах Банка, расчетно-кассовых центрах, а также структурных подразделениях центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.

Справку о продаже облигаций можно получить в Контакт-центре Банка по короткому номеру 136, ОПЕРУ центрального аппарата Банка по адресу: Минск, пр-т Жукова, 3, тел.: (8-017) 229-61-29, 218-58-54, а также в следующих филиалах Банка:

г. Брест, ул. Воровского, 11, тел.: (8-0162) 27-72-29, 27-72-31;
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел.: (8-0212) 35-84-69, 35-84-80;
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел.: (8-0232) 79-26-49, 79-87-01;
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел.: (8-0152) 79-52-80, 79-52-81;
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел.: (8-0222) 29-38-00, 29-38-16;
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8

# ІВАН ЯКУБОЎСКІ, БРАНЯТАНКАВЫ МАРШАЛ

**Іван Ігнатавіч Якубоўскі (7 студзеня 1912 года, па старым стылі — 25 снежня 1911-га, вёска Зайцава, цяпер у Горацкім раёне Магілёўскай вобласці — 30 лістапада 1976 года, Масква) — савецкі военачальнік, Маршал Савецкага Саюза. Двойчы Герой Савецкага Саюза, Герой ЧССР. Беларус. Працаваў па найме ў вёсцы, скончыў сельскую школу. Затым — два курсы Аршанскага педагагічнага тэхнікума. У 1932 годзе прызваны ў Чырвоную Армію. Скончыў Беларускую аб'яднаную ваенную школу імя М.І. Калініна ў Мінску ў 1934 годзе, накіраваны служыць камандзірам вучэбнага ўзвода ў 27-ю Омскую Чырванасцяжную стралковую дывізію (Віцебск). Служыў у Беларускай ваеннай акрузе — камандзір танкавага ўзвода, камандзір танкавай роты, начальнік штаба танкавага батальёна, выкладчык Пухавіцкага пяхотнага вучылішча. Камандаваў танкавай ротай у Польскім паходзе Чырвонай Арміі ў верасні 1939 года ў складзе войскаў Беларускага фронту і ў савецка-фінскай вайне 1939-1940 гадоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнічаў у абарончых баях у Беларусі, у абароне Мінска, ваяваў у асаджаным Магілёве, камандаваў танкавым палком, брыгадай, корпусам. Па-геройску змагаўся на Варонежскім, Браншкім, Цэнтральным, 1-м Украінскім франтах у Курскай бітве на арлоўскім напрамку, бітве за Днепр, у вызваленні Кіева і Фастава. За гераізм у баях за Фастаў палкоўніку І.І. Якубоўскаму 10 студзеня 1944 года прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Вясной 1944 года танкавая брыгада палкоўніка Якубоўскага паспяхова дзейнічала ў Праскураўска-Чарнавіцкай наступальнай аперацыі. Удзельнічаў у Львоўска-Сандамірскай і Вісла-Одэрскай аперацыях. За геройскія дзеянні ў Львоўска-Сандамірскай аперацыі І.І. Якубоўскаму ў другі раз прысвоена званне Героя Савецкага Саюза ўказам ад 23 верасня 1944 года. Удзельнічаў у Берлінскай і Пражскай аперацыях. Некалькі разоў быў паранены, гарэў у танку. Пасля вайны — на розных камандных пасадах. З красавіка 1967 года — першы намеснік міністра абароны СССР, з ліпеня 1967-га — адначасова і Галоўнакамандуючы Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі дзяржаў — удзельніц Варшаўскага дагавора. 12 красавіка 1967 года яму прысвоена званне Маршала Савецкага Саюза. Адзіны беларус, які меў такое высокае воінскае званне.**

## «Усё магло пайсці па-іншаму»

За два гады да першай сусветнай вайны, 7 студзеня 1912 года, у сям'і беларускага селяніна Ігната Лявонавіча Якубоўскага нарадзіўся сын Іван. Нічым не вызначалася нараджэнне яшчэ аднаго, шостага, дзіцяці ў нізенькай, пакрытай саломай, чатырохсценнай хаціне. Бацька — нязменны пастух у вёсцы Зайцава Горацкага павета на Магілёўшчыне. Маці, Акуліна Андрэеўна, хварэла, памерла ў сямнаццатым. Хатнія клопаты пра вялікую сялянскую сям'ю ляглі на плечы жонкі старэйшага сына, Мікіты, Агаф'і Захараўны, якая прыклала нямала працы для выхавання дзяцей. Калі зазірнуць наперад, немагчыма абысці маўчаннем двух братоў Якубоўскага — радавога Аляксандра, які загінуў у баях у сорак першым, і Кірылу, камісара палка, які загінуў у сорак другім у баях пад Ржэвам. У 1944 годзе за сувязь з партызанамі гітлераўцы расстралялі Агаф'ю Захараўну разам з дваццацігадовай дачкой Аксіньяй. Чатыры трагічныя смерці толькі на адну сям'ю простых беларускіх сялян.

...Першы клас школы супаў для малодшага сына сям'і Якубоўскіх з першым мірным годам пасля грамадзянскай вайны. Восенню ў простай кашулі, у лапцях, з букваром хлопчык адпраўляецца ў школу. Дзесяць кіламетраў кожны дзень у адзін канец з акрайцам жытняга хлеба, у любое надвор'е... Сем класаў скончаны. Сям'я ледзь-ледзь перабіваецца з хлеба на квас. Бацька ўсё часцей пагаворвае: «Ці не пара канчаць з гэтым, Ваня?» У трыццатым сяло стала калгасным, а камсамолец Іван Якубоўскі абіраецца сакратаром куставой ячэйкі Макар'еўскага сельсавета.

Не адразу наладзілася калгаснае жыццё. Але моладзь пацягнулася да вучобы. У большасці сялян не было спраўных ботаў ці чаравікаў. Абутак у літаральным сэнсе здабываўся ў лесе. З лыка плялі лапці, якія называлі сліпамі. У такім абутку і прыйшоў у павятовы горад Горкі Іван Якубоўскі, каб здаць дакументы ў найстарэйшую беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

*— Не ўдалося мне навучыцца на агранома, і не таму, што я не мог бы здаць прыёмныя іспыты, — напіша шмат пазней у сваёй кнізе ўспамінаў «Зямля ў агні» Іван Ігнатавіч. — Добра прайшоў я па фізіцы і хіміі, і, магчыма, усё было б па-іншаму, ды падаспелі іншыя справы. Жыццё было цяжкае. Прыйшлося пайсці працаваць на цагляны завод. Пазней райкам камсамола паслаў мяне на вучобу ў Оршу, у педагагічны тэхнікум, і я рыхтаваўся стаць настаўнікам. Адвучыўся два гады. Мяне, у той час кандыдата ў члены партыі, выклікалі ў райкам і паведамілі хвалюючую вестку пра тое, што пасылаюць у армію, што ёсць рашэнне аб умацаванні вайсковых радоў партыйнымі камандзірскімі кадрамі. Прайшоў адборачную і медыцынскую камісіі, а на мандатную паехаў у Мінск. Можаце ўявіць маё здзіўленне, калі я нечакана ўбачыў за сталом камісіі героя грамадзянскай вайны Сямёна Канстанцінавіча Цімашэнку. Ну, думаю, калі сам Цімашэнка прыехаў, значыць, важная справа. Узнёслы настрой змяніўся сумненнем — раптам не падыду. Аднак падышоў. На камісіі мне сказалі, што педтэхнікум прыдзецца пакінуць і пайсці па дарозе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.*

Якубоўскага залічваюць у Аб'яднаную Беларускую ваенную школу імя М.І. Калініна. Добрасумленна, упарта авалодвае ён майстэрствам ваеннай прафесіі. Яго лічаць лепшым спартсменам.

## Майстэрства ваеннай прафесіі

Увосень 1934 года ў Мінску на плошчы Свабоды камкор С.К. Цімашэнка зачытаў перад строем загад аб выпуску лейтэнантаў, падпісаны намеснікам наркама абароны СССР М.М. Тухачэўскім. Менавіта на гэтай плошчы праз сем гадоў, у чэрвені 1941 года, капітану Якубоўскаму давядзецца прымаць першы бой з грозным ворагам. Але да гэтага былі яшчэ шэсць гадоў службы ў БВА, у 27-м артпалку 27-й Омскай двойчы Чырванасцяжнай стралковай дывізіі, якой тады камандаваў герой грамадзянскай вайны, кавалер чатырох ордэнаў Чырвонага Сцяга С.С. Вастрацоў.

Кіраўніцтва дывізіі ўлічвае якасці выпускніка-выдатніка, выкладзеныя ў характарыстыцы, і прызначае яго камандзірам вучэбнага ўзвода. У яго падначаленні 35 чалавек. На ўзбраенні — чатыры 122-міліметровыя гаўбіцы. Камандзір дывізіёна Кабатчыкаў дае выдатны водгук маладому камузвода, адзначае трывалыя веды, патрабавальнасць да самога сябе і да байцоў, яго педагагічную жылку. Неўзабаве ўзвод выходзіць на першае месца ў палку і дывізіі. Якубоўскага накіроўваюць на Ленінградскія Вышэйшыя Чырванасцяжныя бранятанкавыя курсы ўдасканалення камандзіраў РСЧА.

За сем напружаных месяцаў чарговай вучобы ён авалодвае майстэрствам ваджэння танка, навыкам стральбы і кіравання танкавымі падраздзяленнямі. У 23 гады ў 16-й

**Першая сутычка з ворагам у раёне плошчы Свабоды. Мінск 26.06.1941.**

лёгкатанкавай брыгадзе Якубоўскі камандуе танкавым узводам, а затым ротай вучэбна-танкавага батальёна. З гэтага часу яго запалам, яго клопатам, радасцю і горам, часам нават яго жыллём становіцца цесная сталёвая скрынка баявой машыны. У трывожны час ішло станаўленне будучага маршала.

Восенню 1939 года на пасадзе камандзіра танкавай роты Іван Ігнатавіч прымаў удзел у вызваленчым паходзе ў заходнія вобласці Беларусі. А зімой 1939/1940 гадоў ён атрымаў баявую практыку ў ходзе савецка-фінскай вайны. Ротны Якубоўскі ваяваў у той час у складзе 22-га лёгкатанкавага палка.

Неўзабаве — вяртанне на родную беларускую зямлю. Спачатку — у Пухавічы, у пяхотнае вучылішча на пасаду старшага выкладчыка аўтабранятанкавай справы, а потым, у красавіку 1941-га, пад Мінск, у Чырвонае Урочышча, дзе ён прыняў танкавы батальён у 26-й танкавай дывізіі, якой камандаваў генерал Віктар Цімафеевіч Обухаў.

«Бліжэйшы наш палігон знаходзіўся ў раёне населеных пунктаў Малы і Вялікі Трасцянец. Там, разбіўшы лагер у лесе, мы і займаліся ваеннай вучобай аж да 21 чэрвеня», — успамінаў І.І. Якубоўскі.

## З ворагам — твар у твар

А потым прыйшоў дзень 22 чэрвеня 1941 года. Іван Якубоўскі — камандзір танкавага батальёна.

У хуткацечных баях 24—26 чэрвеня 1941 г. на блізкіх подступах да сталіцы Беларусі перад капітанам Якубоўскім была пастаўлена задача ў складзе экіпажаў сямі танкаў Т-26 ліквідаваць варожы дэсант, які прарваўся ў раён плошчы Свабоды. На працягу трох гадзін задача была выканана. Затым баі працягваліся ў раёне завода імя Варашылава і Чырвонага Урочышча. Полк страціў у баях за Мінск шэсць сваіх танкаў, а варожых знішчыў звыш дзесяці. З захаду Мінск прыкрывала 64-я стралковая дывізія палкоўніка С.І. Іаўлева, а з паўночнага захаду — 100-я стралковая дывізія генерала І.М. Русіянава. Менавіта ў 100-й стралковай дывізіі ўпершыню ў гады Вялікай Айчыннай у барацьбе з варожымі танкамі былі ўжытыя бутэлькі з гаручай сумессю. Іх выкарысталі два капітаны: беларус Ф. Каўрыжка і ўкраінец В. Цяртычны. У наступныя дні 51-ы танкавы полк Якубоўскага вёў цяжкія абарончыя баі на рацэ Бярэзіне і пры абароне Магілёва. Тут полк Івана Ігнацьевіча ўпершыню ў гады вайны захапіў у палон каля 400 гітлераўцаў.

Першую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонага Сцяга — у суровым 1941 годзе падпалкоўнік І.І. Якубоўскі атрымаў менавіта ў баях за Магілёў.

Ён праяўляе асабістую адвагу і ініцыятыву. Пазней на пасадзе камандзіра палка і намесніка камандзіра 121-й танкавай брыгады ўдзельнічае ў баях на Браншкім і Паўднёвым франтах. Абараняе Маскву.

Увесну 1942 года Іван Ігнатавіч прызначаецца камандзірам 91-й асобнай танкавай брыгады, якая пачынае фарміравацца ў сакавіку. 20 чэрвеня накіроўваецца на Паўднёва-Заходні фронт. Там рэзка пагоршылася становішча, і нашы войскі, стомленыя баямі, вымушаны былі адыходзіць. Брыгада перакідваецца ў Валаконаўку. Ёй было загадана заняць абарону і прыкрываць 169-ю стралковую дывізію 28-й арміі, якая адыходзіла на ўсходні бераг Аскола. Забяспечваючы адыход стралковых часцей, брыгада вяла бой з адкрытымі флангамі, бо суседзяў побач не аказалася, што вельмі пагаршала становішча. На вузкім участку танкісты стрымлівалі націск гітлераўскай дывізіі, пастаянна падвяргаючыся ўдарам варожых бамбардзіроўшчыкаў.

1 ліпеня праціўнік правёў магутную бамбёжку з пікіравання і пад штармавым накатам артылерыйскага агню ажыццявіў камбінаваную атаку пяхоты і танкаў. Але варожыя машыны, наткнуўшыся на міннае поле, закладзенае ноччу мотастралкамі, павярнулі і падставілі свае барты пад прыцэльны агонь нашых процітанкавых гармат і бранябойшчыкаў. Савецкія байцы не завагаліся, падпусцілі машыны ворага як мага бліжэй і ўдарылі па ім усім, чым маглі. Танкі гарэлі. Гітлераўцы выклікалі авіяцыю і працягвалі атакі. Мужна змагалася маладая брыгада, не зрабіўшы ні кроку назад. Батарэі біліся да апошняга снарада, мотастралкі кідаліся ў рукапашную. Былі моманты, калі танкі праціўніка даходзілі да каманднага пункта. Камандзір брыгады праяўляў моцную волю, уменне і вопыт. Ён давяраў байцам не менш, чым яны давяралі яму.

Беспярэчна выконваліся ўсе яго каманды. Усе ведалі: камбрыг разам з імі, побач, камандуе, значыць, верыць у перамогу. У адным з баёў супрацьтанкавая міна выбухнула пад колам аўтамабіля. Якубоўскі быў кантужаны, атрымаў першую дапамогу і ўсю ноч кіраваў пераправай. Такім яго запомнілі ля Аскола.

## Дзе Якубоўскі — там поспех

Гэта былі цяжкія бітвы нашых войскаў з ворагам на далёкіх подступах да Сталінграда. Пачалася найвялікшая бітва ў міжрэччы Волгі і Дона, роўнай якой не ведала сусветная гісторыя. Напружанасць узброенай барацьбы ўзрастала з кожным днём. Цэнтрам яе стаў Сталінград. Змагаючыся пад дэвізам «За Волгай для нас зямлі няма!», савецкія войскі адбілі люты націск ворага і нанеслі сакрушальны ўдар у адказ. Сіламі трох франтоў — Паўднёва-Заходняга, Данскога і Сталінградскага — 330-тысячная групоўка Паўлюса і Гота была акружана і разгромлена. Дастойны ўклад у разгром фашысцкіх захопнікаў у бітве ля сцен волжскай цвярдыні ўнесла і 91-я асобная танкавая брыгада Івана Якубоўскага, якая змагалася тут больш за чатыры месяцы.

Камандуючы 3-й гвардзейскай танкавай арміяй генерал Павел Сямёнавіч Рыбалка адгукаўся пра гэтыя падзеі так: «Там, дзе Якубоўскі, там я спакойны, там абавязкова будзе поспех» .

Злучэнні гэтай танкавай арміі выканалі вялікую ролю ў барацьбе з ворагам і на Арлоўскім напрамку. Яны актыўна садзейнічалі войскам Бранскага і Цэнтральнага франтоў у разгроме мцэнскай, крамской і арлоўскай груповак ворага. Асобная танкавая брыгада Івана Якубоўскага не раз атрымлівала адказныя баявыя задачы і з поспехам іх выконвала.

Курская бітва перарасла ў грандыёзнае стратэгічнае наступленне савецкіх войск.

Пачалося вызваленне левабярэжнай Украіны. На поўдзень ад Кіева, супраць Вялікага Букрына, паўстаў плацдарм. Войскі сыходзіліся ў лютых атаках. Гітлераўцы сціскалі падкову небяспечнага для іх плацдарма, не шкадуючы людзей і металу. Брыгада Якубоўскага на плацдарме — часцінка вялікага і адзінага цэлага. Генерал-фельдмаршал Манштэйн спазнаў савецкіх танкістаў і пад Сталінградам, і на Курскай дузе. Цяпер яны нацэліліся на Кіеў. Манштэйн разважаў так: савецкі Вярхоўны не пасылае танкавую гвардыю на другарадныя ўчасткі. Удар па Кіеву будзе адсюль, толькі адсюль! Манштэйн перакідвае да Вялікага Букрына свае галоўныя сілы. Тым часам танкавая армія П.С. Рыбалкі таемна ад ворага здымаецца з плацдарма і накіроўваецца да Люцежа, дзе на самай справе намечаны галоўны ўдар па кіеўскай групоўцы. Немцы не здолелі разгадаць гнуткую стратэгічную задумку савецкага камандавання і па-ранейшаму кідалі рэзервы да Букрына.

Люцеж! Адсюль вырашана нанесці маскіраваны ўдар з мэтай вызвалення Кіева і разгрому Задняпроўскай групоўкі. Танкавая брыгада І.І. Якубоўскага адкрыла начны марш. Вызваленне Кіева, як вядома, заняло ўсяго трое сутак, з 3 па 6 лістапада. Гэта была бліскучая аперацыя, праведзеная ў імклівым тэмпе, нечаканая, масіраваная, не разгаданая праціўнікам, нягледзячы на буйное сканцэнтраванне савецкіх войскаў.

Трэцяя гвардзейская танкавая армія рашучымі дзеяннямі перарэзала шляхі адыходу саперніку на захад, стварыла пагрозу яго акружэння ў раёне Кіева. Танкавыя злучэнні імкліва развівалі наступленне на поўдзень — на Васількоў і Фастаў. Фастаў — буйны чыгуначны вузел, як бы цэнтр камунікацыйных нерваў. Простага позірку на карту дастаткова, каб зразумець яго значэнне. І.І. Якубоўскі зарэкамендаваў сябе тут удумлівым, ініцыятыўным і арганізаваным афіцэрам.

**Наведваючы родныя мясціны, заўсёды казаў: «Калі што, звяртайцеся». І сапраўды дапамагаў усім, хто прасіў яго аб дапамозе.**

У яго моцная воля, але, патрабуючы таго ж ад падначаленых, ён ніколі не квапіцца на іх асабістую годнасць. Ён верыць байцам і афіцэрам і разумна беражэ іх, і яму адказваюць суровай салдацкай любоўю. Да таго часу, а ішоў ужо трэці год вайны, у Якубоўскага склаўся і свой індывідуальны «почырк»: за ім замацавалася слава майстра дзёрзкіх танкавых рэйдаў. У манеўранай вайне Якубоўскі змог разгарнуць свае незвычайныя здольнасці. Танкавыя злучэнні, якімі ён камандаваў, не раз былі выкарыстаныя як зруйнавальны сталёвы клін, што рассякаў праціўніка, расчышчаючы шлях для наступных бранявых валоў танкавага патоку.

Далейшае развіццё падзей дазволіла ўбачыць у Якубоўскім не толькі майстра танкавых рэйдаў. Калі праціўнік, засяродзіўшы буйныя сілы танкаў, хацеў вярнуць горад Фастаў, Якубоўскі арганізаваў сапраўды сталёвы абарончы пояс і вытрымаў трохдзённыя адчайныя атакі пераўзыходзячых сіл танкавай дывізіі ворага, падтрыманай масіраванымі налётамі штурмавікоў.

Не ўдалося гітлераўцам вярнуцца да Дняпра. Дзесяць выхаванцаў брыгады Якубоўскага сталі Героямі Савецкага Саюза. Вось узнагародны ліст і на палкоўніка І.І. Якубоўскага, падпісаны камандуючым 3-й гвардзейскай танкавай арміяй генерал-лейтэнантам П.С. Рыбалкам і членам Ваеннага савета арміі генерал-маёрам С.І. Мельнікавым: «Камандуючы 91-й асобнай танкавай брыгадай з першых дзён яе арганізацыі тав. Якубоўскі шмат прыклаў сілы і энергіі па арганізацыі асабовага складу брыгады і па падрыхтоўцы яе да баявых дзеянняў. У Арлоўскую аперацыю арміі на Браншкім і Цэнтральным франтах (ліпень-жнівень 1943 года) брыгада пад кіраўніцтвам тав. Якубоўскага ўсе баявыя задачы выканала. У аперацыі арміі па фарсіраванні р. Днепр і ў баях па авалоданні горадоў Кіеў і Фастаў тав. Якубоўскі пастаянна знаходзіўся ў баявых парадках брыгады, умела кіраваў брыгадай у самых складаных умовах бою. Брыгада пад кіраўніцтвам тав. Якубоўскага смелымі, рашучымі дзеяннямі авалодала 6.11.43 г. горадам Фастаў, нанёсшы ворагу вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы, за што брыгаду сталі называць «Фастаўскай».

Першая Зорка Героя Савецкага Саюза ўвянчала ратную працу чалавека, які дзень і ноч, суткі і месяцы праводзіў або ў танку, або на бронетранспарцёры, або ў самаходцы, або ў штабной машыне. Ён еў з агульнага катла, спаў пад брызентам, саграваючыся цяплом танка, якое яшчэ захавалася пасля бою. На ім часцей быў скураны шлем, чым фуражка, і напагатове пісталет, пара «лімонак» на выпадак і аўтамат з набітым патронамі дыскам.

Іван Ігнатавіч заўсёды быў гатовы да вырашэння самых нечаканых і складаных задач, заўсёды быў скіраваны да перамогі. Потым былі баі за Корасцень, Жытомір, у азнаменаванне вызвалення якога брыгада была ўдастоена ордэна Чырвонага Сцяга, за Праскураў, Ярмолінку, Цярнопаль, дзясяткі гарадоў і сотні паселішчаў Правабярэжнай Украіны. Гэта было зімой і вясной 1944 года. Затым быў Львоўскі напрамак.

У той час І.І. Якубоўскі быў намеснікам камандзіра 6-га гвардзейскага танкавага корпуса, які, дзейнічаючы наперадзе галоўных сіл арміі, сышоў у глыбокі рэйд, вызваліў намечаныя пункты і перарэзаў камунікацыі праціўніка ад Львова на Яраслаў і Перамышль. Гэты горад, размешчаны на рацэ Сан, быў крэпасцю, вядомай яшчэ з часоў Першай сусветнай вайны. Яе ўмацаванні захаваліся. Мадэрнізаваныя і прыстасаваныя да ўмоў сучаснасці, яны адказвалі паняццю «моцны арэшак», які, здавалася, проста не разгрызці. Ды танкісты Якубоўскага разгрызалі.

## Напярадзе — Берлін

У сваіх «Запісках камандуючага фронтам. 1943-1944 гг.» Маршал Савецкага Саюза І.С. Конеў расказваў:

*«2 жніўня, пераправіўшыся праз Віслу, я вырашыў праверыць характар дзеянняў нашых войск па пашырэнні плацдарма. Мяне галоўным чынам цікавіў правы фланг нашай групоўкі. Тут камандармам 3-й гвардзейскай танкавай арміі генералам П.С. Рыбалкам быў вылучаны перадавы атрад пад камандаваннем палкоўніка І.І. Якубоўскага. Заязджаючы на вышыні каля Сташува, я убачыў рослага танкіста, які стаяў ля дарогі. Я спыніў сваю машыну і высветліў, хто ён і якую мае задачу. Гэта быў палкоўнік І.І. Якубоўскі . Ён далажыў, што з'яўляецца камандзірам перадавога атрада і мае задачу высунуцца ў раён Сташува, каб знішчыць групоўку праціўніка, якая нядаўна тут контратакавала. Палкоўнік І.І. Якубоўскі вельмі грунтоўна далажыў абстаноўку, а яго рашучасць і ўпэўненасць у выкананні пастаўленай задачы склалі прыемнае ўражанне. Добра было ведаць, што нашымі танкістамі камандуюць такія смелыя, надзейныя і разумныя афіцэры».*

23 верасня 1944 года аб'яўляецца Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. П.С. Рыбалка на тым жа Сандамірскім плацдарме ўручае І.І. Якубоўскаму другую «Залатую Зорку».

Апошні акт вялікай бітвы. Вюнсдорф! Адзін з мноства нямецкіх гарадкоў. Якубоўскі тут ненадоўга. Асабістая праверка часцей корпуса, сустрэча з камандзірамі, удакладненні, пастаноўка аператыўных задач. Вюнсдорф абстрэльваюць. Выпадковы снарад разрываецца зусім блізка ад Івана Ігнатавіча. Шафёр звяртае ўвагу — парваны бот, шмат крыві. Машына спынена. Генерал спрабуе ўстаць, але не можа. Яго вязуць у палявы шпіталь...

Так для яго скончылася Вялікая Айчынная вайна.

## Адказныя дні

Пасля перамогі Іван Ігнатавіч Якубоўскі скончыў Ваенную акадэмію Генеральнага штаба. За гады пасляваеннай службы ў Савецкай Арміі ён прайшоў шлях ад генерал-маёра да Маршала Савецкага Саюза — гэтага звання быў удастоены ў 1967 годзе. У красавіку таго ж года прызначаны першым намеснікам міністра абароны СССР, у ліпені — Галоўнакамандуючым Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі дзяржаў — удзельніц Варшаўскага дагавора.

Зразумела, гэта — не кабінетная праца.

Вось, напрыклад, праверка Паўднёвай групы войск. Яе праводзіць штаб Аб'яднаных узброеных сіл Варшаўскага дагавора. Групавая газета «Ленинское знамя» падрабязна распавядае пра вучэнні.

«Гэта адказныя дні. Тым больш што на заключны этап вучэнняў павінен прыляцець не хто-небудзь іншы, а сам Галоўнакамандуючы Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі Варшаўскага дагавора — намеснік міністра абароны СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза, Маршал Савецкага Саюза Іван Ігнатавіч Якубоўскі. Франтавік, легендарная ў войсках асоба, пра якую сярод ваеннага люду ходзіць маса ўсялякіх гісторый. Сур'ёзных і не вельмі. У якасці фінальнай «фішкі» гэтых манеўраў планавалася правесці навядзенне пантоннамаставой пераправы праз Дунай сіламі двух інжынерна-сапёрных батальёнаў Венгерскай народнай арміі і Паўднёвай групы войск», — піша ваенны журналіст Віктар Літоўкін.

Ці трэба казаць, што аперацыя гэтая, якая рэгулярна паўтаралася падчас візітаў высокіх ваенных чыноў узроўню міністра абароны, яго намеснікаў ці начальніка Галоўнага палітычнага ўпраўлення СА і ВМФ, даўно адпрацаваная сапёрамі абодвух бакоў практычна да аўтаматызму. Хоць паглядзець на іх работу, вядома ж, заўсёды цікава. Да абодвух берагоў Дуная ў досыць шырокім, метраў 500, месцы падыходзяць дзве калоны цяжкіх КрАЗаў з пантоннымі і рачнымі катарамі ў кузаве. Уся гэтая гаспадарка скідаецца ў ваду. Пантоны раскрываюцца, салдаты заскокваюць у катары і, змагаючыся з плынню, сцягваюць бусакамі звёны пантонаў у адну лінію, злучаюць іх адмысловымі клямарамі і заціскамі ў сталёвы наплаўны мост, па якім потым з аднаго берага на другі павінны ісці танкі і іншая бранятэхніка. Для ўзмацнення эфекту сапраўднага бою на пераправу пікіруюць ударныя верталёты і штурмавікі, у глыбіні выбухаюць, уздымаючы хвалі і тысячы пырскаў, глушачы заадно і рыбу, абліваючы сапёраў і баявую тэхніку халоднай дунайскай вадой, імітацыйныя боепрыпасы. Словам, хоць здымай чарговае «Вызваленне» або «Падзенне Берліна».

Аб чарговым навядзенні такога моста, сведкам чаго павінен стаць маршал Савецкага Саюза Якубоўскі, карэспандэнт газеты» Ленинское знамя» ўжо напісаў рэпартаж (балазе, загадзя пабываў на генеральнай рэпетыцыі сапёраў, пагутарыў з усімі, хто яму быў патрэбны, зрабіў неабходныя здымкі). Матэрыял стаяў у паласе, што называецца, быў заліты ў метал на стале ў вярстальшчыка. Патрэбен быў яшчэ толькі адзін кадр, на якім прысутнічаюць камандуючы групы Герой Савецкага Саюза генерал-палкоўнік Барыс Іваноў і, вядома ж, маршал Савецкага Саюза Іван Якубоўскі. Але праблема ў тым, што зрабіць гэты здымак можна было толькі падчас саміх вучэнняў, калі абодва военачальнікі будуць назіраць за навядзеннем пантоннамаставой пераправы.

Для таго каб журналіст паспеў зрабіць такі здымак і своечасова прывёз яго ў рэдакцыю, адказны рэдактар газеты палкоўнік Фёдар Канавалаў нават выдзеліў яму сваю персанальную машыну. І той, апрануты ў цывільнае, каб не зіхацець лейтэнанцкімі пагонамі перад генераламі і палкоўнікамі, не нарывацца на заўвагі і недарэчныя прыдзіркі, маячыў перад драўлянай трыбунай, збудаванай на беразе Дуная, недалёка ад таго месца, дзе планавалася наводзіць пераправу. Маршал Якубоўскі і генерал Іваноў ужо стаялі на гэтай трыбуне, але сфатаграфаваць іх не было ніякай магчымасці, вакол круцілася столькі ваеннага народу, што выхапіць кадр, дзе былі б яны толькі ўдваіх, не ўяўлялася магчымым.

**Батарэі біліся да апошняга снарада, мотастралкі кідаліся ў рукапашную. Былі моманты, калі танкі праціўніка даходзілі да каманднага пункта. Камандзір брыгады праяўляў моцную волю, уменне і вопыт. Ён давяраў байцам не менш, чым яны давяралі яму.**

«Раптам на маё шчасце, піша Віктар Літоўкін, Якубоўскі прыабняў Іванова за плечы і павёў кудысьці ў бок ад трыбуны. Я крыху воддаль рушыў услед за імі. Аказалася, маршал вядзе генерала да... дашчатага туалета тыпу сарцір, як сказалі б цяпер. Ён адчыніў дзверы гэтага збудавання і... о, жах, не змог увайсці — дзверы былі занадта вузкімі для маршала, мужыка ростам пад два метры і вагой у добрых паўтара цэнтнера.

— Не мог ты, Іваноў, — пачуў я грамавы голас Якубоўскага, — нармальны ср...нік для Галаўкама паставіць!..

— Я разбяруся са сваімі сапёрамі, — апраўдваўся камандуючы, — але, думаю, ён пабудаваны па стандартах, зацверджаных галоўным інжынерным упраўленнем.

— Чорт бы пабраў гэтыя стандарты, — разлавáўся Якубоўскі і рашуча пакрочыў у кусты.

Праз пару хвілін военачальнікі выйшлі з зараснікаў. Я падскочыў да іх:

— Таварыш Маршал Савецкага Саюза, дазвольце сфатаграфаваць вас з камандуючым ПГВ для нашай групавой газеты.

— Валяй, — скамандаваў мне Якубоўскі. Злосць яго кудысьці выпарылася, ён быў настроены ўжо больш чым прыязна...»

Жарты жартамі, але час і абстаноўка ў свеце тады былі зусім не жартоўнымі. Супрацьстаянне двух ваенна-палітычных блокаў, дзвюх сістэм патрабавала пастаяннага напружання сіл. І маршал заўсёды ў дарозе. Напярадзе былі і чэхаславацкія падзеі...

Не забываўся Іван Ігнатавіч і па Беларусь, памятаў пра сваіх землякоў. Добрае стаўленне да тых, хто вырас побач з ім, ён захаваў на ўсё жыццё. Наведваючы родныя мясціны, заўсёды казаў: «Калі што, звяртайцеся». І сапраўды дапамагаў усім, хто прасіў яго аб дапамозе. У кожнага з іх захаваліся свае ўспаміны пра тое, як Якубоўскі ўжо пры ўсіх сваіх званнях і ўзнагародах прыехаў, напрыклад, на адкрыццё Музея савецка-польскай баявой садружнасці ў Леніна. Антаніна Якубоўская (яе бабуля Агаф'я Захараўна замяніла калісьці Івану Ігнатавічу маці) успамінала:

— Мой тата падышоў да яго і прама прапанаваў: «Іван, я самагонкі выгнаў, зойдзеш?». А там жа — куча людзей і некалькі шэрагаў міліцыі стаяла. Адзін з іх схапіў бацю, але маршал паспеў яму своечасова руку падаць.

**Міністр абароны СССР, Маршал Савецкага Саюза Андрэй Антонавіч Грэчка і Маршал Савецкага Саюза Іван Ігнатавіч Якубоўскі ў размяшчэнні 2-га батальёна 330-га танкавага палка 14-й Гвардзейскай мотастралковай дывізіі. 1968 г.**

Абняліся. Тата быў высокі, але худы, а Іван Ігнатавіч — вельмі здаровы. Настолькі, што мой бацька баяўся задыхнуцца ў гэтых абдымках.

Якубоўскі прыехаў з вялікім мяшком цукерак. У кожную дзіцячую далоньку насыпаў па добрай жмені. Дзятва была шчаслівая. Запомніліся яго шырокія штаны, у іх маглі змясціцца ці не чацвёра хлапчукоў. Потым дарослыя за агульным сталом спявалі песні...

| Сведения **о земельном участке** | **Целевое назначение:** для использования под здание треста и строительных управлений, стоянку автомашин. **Площадь (га):** 0,7811. **Вид права:** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. **Обременения (ограничения):** водоохранная зона водных объектов (река Западная Двина), площадь 0,7811 га |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Тукиш В.Е. завхоз, контактный телефон МТС +375333465090. |

**Условия аукциона:** покупатель обязан предоставить Продавцу административные помещения на 2-м этаже здания треста и строительных управлений согласно прилагаемому плану помещений в безвозмездное пользование на период с момента перехода права собственности на предмет аукциона к покупателю до момента ликвидации Продавца. С планом помещений, подлежащих передаче Продавцу в безвозмездное пользование, можно ознакомится на сайте Организатора торгов WWW.CPO.BY

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: 30** (тридцать) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не будет предусмотрено договором купли-продажи)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 17.11.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.12.2016** в 14 ч.00 мин. по адресу: **РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **23.12.2016** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «НЕРУДПРОМ», г. Минск, ул. Асаналиева, 72 |

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Квартира** | 40,8 кв.м | 600/D-89149 | Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Зеленая, 1В-99 |

**Начальная цена лота №1 без НДС – 76 602 руб. 46 коп.** (766 024 600 бел. руб.)

***Транспорт и спецтехника***

| № лота | Наименование | Инв. номер по бухучету |
|---|---|---|
| 2 | **Автомобиль МАЗ 500А, гос. номер КА 7474, г.в. 1978** | 7474 |
| **Начальная цена лота №2 с НДС – 4 640 руб. 16 коп.** (46 401 600 бел. руб.) | | |
| 3 | **Трактор МТЗ-82Л, гос.номер 7485 ОА, г.в. 1979** | 3585 |
| **Начальная цена лота №4 с НДС – 6 496 руб. 22 коп.** (64 962 200 бел. руб.) | | |
| Месторасположение лотов №2 и №3 — Минский р-н, Петришковский с/с, р-н д. Захаричи, ДСЗ «Заславль» | | |
| 4 | **Автомобиль МАЗ 55514 020, гос.номер КІ 4543, г.в. 2002** | 4345 |
| **Начальная цена лота №3 с НДС – 9 570 руб. 34 коп.** (95 703 400 бел. руб.) | | |
| 5 | **Автокран Краз 250, гос.номер 4186 МИН, г.в. 1991** | 4186 |
| **Начальная цена лота №5 с НДС – 19 488 руб. 67 коп.** (194 886 700 бел. руб.) | | |
| Месторасположение лотов №4 и №5 — г. Минск, ул. Асаналиева, 72 | | |
| 6 | **Трактор МТЗ-82 1, гос.номер КА-7 0409, г.в. 2002** | 3993 |
| Месторасположение лота №6 — Минский р-н, Петришковский с/с, д. Большая Воловщина, ПСХ «Колос» | | |
| **Начальная цена лота №6 с НДС – 13 539 руб. 78 коп.** (135 397 800 бел. руб.) | | |

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%), в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **18.01.2017** в 11 ч. 00 мин. по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **16.01.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении аукциона
## ПОКОЛЮБИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность, расположенных на территории Поколюбичского сельсовета

| Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Начальная цена предмета аукциона | Затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета |
|---|---|---|---|---|
| 321084803606000011 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1500 га. Гомельская область, Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, деревня Лопатино, улица Школьная, участок №1 | Водопровод имеется. Газопровод имеется. Дорога – асфальтное покрытие | 15742,21 (Пятнадцать тысяч семьсот сорок два рубля 21 копейка) | Расходы в сумме 1194,46 (Одна тысяча сто девяноста четыре рубля 46 копеек) и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 1574,22 (Одна тысяча пятьсот семьдесят четыре рубля 22 копейки) на р/с 3641414130036 ф-ла 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель — Поколюбичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 |
| 321084803601000271 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1500 га. Гомельская область, Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, деревня Лопатино, улица Школьная, участок №2 | Водопровод имеется. Газопровод имеется. Дорога – асфальтное покрытие | 15823,01 (Пятнадцать тысяч восемьсот двадцать три рубля 01 копейка) | Расходы в сумме 1380,78 (Одна тысяча триста восемьдесят рублей 78 копеек) и расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 1582,30 (Одна тысяча пятьсот восемьдесят два рубля 30 копеек) на р/с 3641414130036 ф-ла 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель — Поколюбичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 |

**Аукцион проводится 08 февраля 2017 года в 15.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а в административном здании Гомельского райисполкома (малый зал, 3-й этаж).**

**Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Поколюбичи, ул. Ленина В.И., 133, 1-й этаж, каб. 3 с даты опубликования по 03.02.2017 с 8.30 до 17.00, обед — 13.00-14.00, выходные дни — суббота, воскресенье.**

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Поколюбичским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Кроме того, в комиссию или организацию предоставляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право приобретения земельного участка в частную собственность;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка.

2. В течение двух месяцев, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87).

3. Выполнить услов

■ У вянок Францыску Скарыну

Слабадан Вуканавіч — часты госць у Беларусі. Быў госцем Гомельскага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. Выступаў у розных аўдыторыях Мінска і раённых гарадоў Беларусі, дзе праводзіўся Дзень беларускага пісьменства. Ён ведае нашу краіну. Добра знаёмы з беларускай літаратурай. У Мінску пабачыла свет кніга вершаў Слабадана Вуканавіча «Я ці не я», творы для якой перакладзены ў асноўным Іванам Чаротам. У адным з інтэрв'ю для беларускага друку чарнагорскі пісьменнік заўважыў наступнае: «Ніхто не здольны спыніць кола цывілізацыі. У мяне складваецца ўражанне, што ў нас, славян, ёсць асаблівы чып упартасці. А можа, гэта чып большай ступені чуласці нашай душы? Мы не можам мірыцца з многімі фактамі, з некаторымі, здавалася б, ісцінамі. Чалавек — гэта кола, якое выпрацоўвае святло, выпрацоўвае і цемру, стварае радасць, боль, смутак. Чалавек сам усё прыдумвае і сам стварае...» З гэтай перакананасцю Слабадан Вуканавіч выступае і ў вершы, які ён прысвяціў беларускаму асветніку, першадрукару Францыску Скарыну. А перакладчыкам ізноў выступае Іван Аляксеевіч Чарота — вядомы і ў Беларусі, і ў краінах былой Югаславіі знаўца славянскіх літаратур.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

Слабадан ВУКАНАВІЧ
(Чарнагорыя)

*ХТО НЕ СЛУХАЕ ЗАЛАТАВУСТАЎ, ТОЙ ПАСЛУХАЕ ГРОМ*
(Малітва за Беларусь)

*Сонца для ўсіх беларусаў —*
*Каб дрэва жыцця пладаносіла*
*І давалі ўраджай бязмежныя нівы,*
*Узнятыя сілай мужчын*
*і працай жанчын.*
*Сонца для тых,*
*Хто спявае і грае,*
*Хто харство і дабро стварае,*
*Хто ўзводзіць будынкі слова,*
*Хто раялем і скрыпкаю прамаўляе,*
*Хто гаворыць жывапісу мовай.*
*Сонца для залатавустага Францыска*
*Скарыны*
*З шэрагу першых творцаў пісьменства беларускага,*
*У славу Барыса Ўсяслававіча,*
*Славу вольнасці Полацка і Віцебска,*
*Гомеля, Брэста, Гродна, Магілёва*
*і Мінска...*
*Дзеля згоды між людзьмі,*
*Дзеля тысяч азёр,*
*Нераставання рыб,*
*Гуртавання буслоў...*
*Сонца для радасці беларусаў,*
*Іхніх усмешак і добрых надзей,*
*Квецені й простага шчасця людзей,*
*Якім патрэбны дажджы на пасевы,*
*А таксама і ясныя дні*
*Для бяспекі самалётаў і цягнікоў.*
*Выпусцім усіх птушак з клетак,*
*Усіх рыб з акварыумаў,*
*Каб усім вольна спявалася*
*І рэвалюцыі праслаўляліся*
*Песнямі замест кулямётаў.*
*Дзеля яснага для беларусаў дня,*
*Дзеля зорамі аздобленага неба,*
*Дзеля колішніх і будучых*
*залатавустаў —*
*Хто зведаў пакуты,*
*Вылечваецца воляй.*
*Мая малітва — маё жаданне ўсяго*
*Дзеля згоды між людзьмі,*
*Дзеля тысяч азёр,*
*Нераставання рыб,*
*Гуртавання буслоў...*
*Хто не слухае залатавустаў,*
*Той паслухае гром,*
*Перажыве засухі і паводкі.*
*Слухайце тых, хто ўмее*
*І гаварыць,*
*І слухаць,*
*І руку падаваць,*
*Вітаючыся: «Дзень добры»*
*і «Добры вечар».*
*Сонца для радасці беларусаў,*
*Іхніх усмешак і добрых надзей,*
*Квецені й простага шчасця людзей,*
*Якім патрэбны дажджы на пасевы.*
*Маё пажаданне для залатавустаў:*
*Няхай беражэ іх Бог, калі чуе,*
*Няхай беражэ іх жыццё, а яно існуе.*
*Пачуй маю малітву... пачуй*
*Ты, які слухаеш і гаворыш,*
*Які хварэў і пакутаваў,*
*А вылечыўся воляй.*

**Пераклад Івана ЧАРОТЫ.**

Валянціна ГАЯВАЯ:

# «Я стварыла птушку фенікс»

■ Сам-насам

**У гэтым годзе адна са стваральніц беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» і яго нязменны мастацкі кіраўнік Валянціна Гаявая адзначыла 80-гадовы юбілей. Яе галоўнаму дзецішчу, справе ўсяго жыцця, як даросламу чалавеку — 42. Як і кожнаму з нас, ансамблю давялося адчуць пад'ёмы і падзенні, лепшыя часы і крызісы. Усё гэта наша гераіня перажывала і перажывае як уласнае — абвострана жыва. Як не паспачуваць роднаму стварэнню? Але менавіта гэта неабыякавасць, любоў да беларускасці на мяжы з болем, без якога творчасць немагчымая, не пакідае гледача без эмоцыі, заклікае спачуваць, вяртацца да вытокаў праз канцэрты «Харошак». Тым, хто не ведае беларускай мовы, хто ніколі не быў у краіне, а часам і нашым суайчыннікам, балетмайстар сваімі нумарамі даступна «выкладае» айчынную гісторыю. У яе танцах мінулае ажывае, становіцца зразумелым і блізкім.**

Фота зроблена падчас аднаго з першых выступленняў «Харошак».

Звычайна гутарка вядзецца ў выглядзе пытанняў і адказаў. Але, застаўшыся адзін на адзін, першае нам не спатрэбілася. У сваім маналогу Валянціна Гаявая паспрабавала акрэсліць гады нястомнай працы, створаныя праграмы і дзясяткі танцаў, якія цяпер што ёсць сілы імкнецца захаваць.

## «Харошкі» ведаюць ва ўсім свеце»

У МЯНЕ фатаграфічная памяць. Магу згадаць усе рухі ў танцах. Артысты не ўсё памятаюць, бо ў нас велізарны рэпертуар! У «Харошак» 64 творы залатога фонду. Апошняе азначае, што іх нельга перарабляць і забываць. А склад артыстаў балета невялікі. Безумоўна, гэта тэатр з нядрэнным рэпертуарам, а ў маіх танцах — гісторыя Беларусі, наша культура, якую варта захоўваць і перадаваць наступным пакаленням.

Што такое твар Беларусі для замежніка? Гэта «Харошкі». Мы з 1976-га штогод ездзілі за мяжу. Там пыталіся: «Адкуль вы?» А мы ў адказ: «З Беларусі». «А дзе тая Беларусь?..» Прынясе, бывае, той іншаземец карту, а мы паказваем пальцам, каб ведаў. «Беларусь» гучала і ў Італіі: «Signori e signore, buonasera! Vi presentiamo un gruppo «Khoroshki» dalla Di Minsk di Belarus». Аднойчы італьянцы зрабілі такую афішу. Яны высветлілі, што геаграфічна Мінск знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. На афішы пасярэдзіне быў Мінск, унізе напісана «Еўропа», а зверху — «Харошкі». Гучыць цяпер як жарт, але няма байкі без праўды...

Асабліва шмат мы гастралявалі ў 1990-х. Тады час быў незразумелы, час няпэўнасці. А ў Еўропе нас ведалі і любілі. Аплачвалі ўсе выдаткі: дарогу, сутачныя, пражыванне. Толькі б прыехалі. Мы пастаянна працавалі на турыстаў, якія наведвалі гэтыя краіны, сачылі за нашымі канцэртамі і ездзілі з горада ў горад. У Італіі і Іспаніі выступалі раз у год, а часам і часцей. Арганізоўвалі вялікія канцэрты, часта на плошчах. Звычайна там, у старых гарадах, у іх цэнтры — раскошны будынак мэрыі ці музея, а перад ім плошча, нібыта спецыяльна пакінутае месца для сцэны. І глядзяцца тыя будынкі як дэкарацыя. Ставіцца сцэна, і «Харошкі» працуюць. Нашы кулісы — той самы цудоўны будынак. Публіка па баках, з балконаў звісаюць, з вокнаў. Крэслаў ставілі столькі, колькі можна было змясціць. Са сцэны бачны адны галовы, ніводнага свабоднага месца.

Цяпер у Еўропе незразумела што робіцца, там не да нас. Што тычыцца Расіі, то патрэбны задатак, каб адпрацаваць канцэрт і пасля вярнуць грошы. Гэта няпроста ў сённяшніх умовах. Тым не менш арганізуем выязныя канцэрты па Расіі: у Цверскую вобласць і Цвер, Маскву і яе вобласць, Суздаль.

## «Хлопца на танцы не аддадзім»

ЗАРАЗ у артыстаў балета непамерна цяжкая праца. Нават калі ездзім на выступленні ў межах Беларусі. Нядаўна былі ў Гомелі. Туды трэба дабірацца пяць гадзін, на месцы ўсяго толькі дзве гадзіны, каб падрыхтавацца, бо працуем выключна ўжывую. Затым — канцэрт на два аддзяленні. Пасля трэба сабраць усе інструменты і прылады, пагрузіць. Самае малое вязём паўтары тоны. Прыязджаем пад раніцу. А заробкі ў танцораў далёка не самыя высокія. Але колькі трэба мець мужнасці і ў той жа час прафесіяналізму, каб вытрымаць усё гэта. Няпроста ўсім. Адназначна сказаць, каму больш — жанчынам ці мужчынам, — складана.

Артысткі ансамбля «Харошкі» першага складу.

На жаль, за мяжу, у невядомасць з'язджаюць працаваць самыя лепшыя, самыя таленавітыя. Калі б не гэта, лепшага ў свеце калектыву за «Харошкі» не было б. Бо ў нас рэпертуар не звычайны, а душэўны. Разлічаны на вялікую духоўнасць, на вяртанне людзей «на кругі свая». Так, апошні наш канцэрт называўся «Покліч продкаў». Калі мы пра іх перастанем памятаць, будзе тое, што і паўсюль: забудзешся, хто ты ёсць насамрэч. І што каштоўнага ў гэтым?

У мяне ёсць знаёмы ўрач-траўматолаг. Звычайна, калі танцор расцягнуў руку ці нагу і пайшоў у паліклініку, надзенуць яму той «валёнак», і чалавек месяц не можа працаваць. А калі доктар таленавіты, то за тыдзень паставіць на ногі. Мне трапіўся менавіта такі. У доктара — тры сыны як на падбор. «У мяне малодшы, што ён вырабляе, куды толькі ногі не закідвае, музыку адчувае», — аднойчы падзяліўся ён. «Дык давайце да мяне ў студыю», — адказваю. «Ну, Валянціна Іванаўна, ён жа мужчына, як ён сям'ю будзе ўтрымліваць?» — разводзіць рукамі знаёмы і, на мой вялікі жаль, мае рацыю. Зараз ва ўсіх харэаграфічных калектывах, каледжах не хапае мужчын. Ад гэтага прафесія церпіць.

Цяпер спрабую выхоўваць прадаўжальнікаў маёй справы. Якія разумелі б да самых глыбінь, наколькі гэта важна — памятаць пра родную мінуўшчыну, захоўваць духоўнасць. Хтосьці ў царкву пойдзе, а хтосьці — і да нас на канцэрт. *(Паказвае на ікону Ісуса Хрыста, якая вісіць над рабочым сталом)*. Свяшчэннікі ходзяць на мае канцэрты. Бо ў нас не ўбачыш нічога непатрэбнага, за што было б сорамна. Ідзе прапаганда самага лепшага: традыцый, гісторыі, на якую забывацца нельга, характараў, абрадаў, фальклору.

### БЛІЦ-АПЫТАННЕ

***— Беларусь ці Расія?***
— Для мяне няма розніцы.
***— Выпадак ці план?***
— Толькі план.
***— Праўда ці прыгажосць?***
— І тое, і другое. Без гэтага я не магу.
***— Мастацтва ці гісторыя?***
— Гісторыя — самае важнае на свеце. Без мінулага ў краіны няма будучыні. Гісторыю трэба памятаць, каб жыў і народ, і дзяржава.
***— Грошы ці самарэалізацыя?***
— Вялікіх грошай ніколі не было, але як балетмайстар я цалкам рэалізавалася.
***— Творчасць ці майстэрства?***
— Творчасці без майстэрства няма.
***— Гарачае сэрца ці халодны разлік?***
— Сэрца гарачае ў любога творчага чалавека, нават вогненнае. Халодны разлік? Гэта не пра мяне. Які можа быць разлік, калі сэрца ўсё патрабуе: «Трэба, трэба!»?..

## «Тэма вайны кранула нават мужчын»

АСАБЛІВА ўдала атрымліваюцца лірычныя нумары. А падказаў мне гэта калісьці Ігар Аляксандравіч Маісееў, стваральнік першага ў СССР ансамбля народнага танца і першай школы народнага танца. Аднойчы прыехаў у Беларусь адбіраць калектыў. «Я хачу сказаць вам дзякуй, вы так мяне парадавалі! У вас, праўда, усё забой ды забой... Рабіце лірыку. У вас атрымаецца», — сказаў ён. І вось у мяне лірыка прыходзіць на такіх апладысментах! Звычайна ўсе чакаюць, што павольны танец пройдзе, а пасля пачнуць танцаваць, будзе весялей сядзець. А ў «Харошак» — наадварот.

У нас ёсць такія нумары — «Лета», «Жытнёвы раманс» і «Журавы». Мы звярнуліся ў іх да тэмы жанчыны падчас вайны. У хроніках часта паказваюць, як яны, слабы пол, плуг цягалі. Ды і я сама ў дзяцінстве працавала на таку. Таму ўяўляю, як гэта было складана. І як жанчыны нараджалі ў полі... Гэты нумар упершыню паказвалі ў Палацы культуры трактарнага завода ў Мінску, на які прыйшлі, вядома ж, перш за ўсё рабочыя. Страшна было, бо невядома, як прымуць нумар. Астатнія танцы шыкоўныя, багатыя, з запалам, касцюмы багатыя. А гэты — шчымліва-мінорны. Напрыканцы гляджу, а ў цэнтры залы стаіць фатограф з газеты і плача. І не ён адзін з прысутных мужчын так адрэагаваў.

## «Праслязіўся нават самы бессардэчны»

У МАГІЛЁВЕ ёсць у мяне адзін знаёмы. Калісьці сем'ямі сябравалі. Жонка ў яго была галоўным рэдактарам жаночага часопіса, а ён сам працаваў у Цэнтральным камітэце Камуністычнай партыі. Запрасіла я іх на новую праграму «Харошак». «Адстань, — адказвае, — я не люблю народнае мастацтва». Але аднойчы ўсё ж такі прыйшоў паглядзець. Сядзеў і... плакаў. «Што здарылася?» — пытаюся. «Да маці паеду. Я так даўно дома не быў», — сказаў ён. Вось што робіць сапраўднае мастацтва з людзьмі. І маці родную ўспомніў.

У 2002 годзе мы трапілі на гастролі ў Амерыку. Адна пажылая пара са штата Юта хадзіла на ўсе без выключэнняў нашы канцэрты, бо кожны раз мы давалі новую праграму, паўтараў быць не магло. Калі «Харошкі» ад'язджалі, яны прыйшлі развітацца і плакалі. Казалі, што «не зможам жыць без вашых танцаў». Ёсць і такія ўражлівыя людзі. Гэта і пра амерыканцаў, і пра італьянцаў.

Ведаеце, так многа вакол спартыўных збудаванняў, пляцовак, секцый, школ. Калі ідзе натоўп адтуль, лаянка стаіць такая, што хочацца пад зямлю праваліцца. Спорт — гэта добра. Але без культуры ні перамог, ні нармальнага чалавечага аблічча ў нацыі не будзе.

Калі мы падчас жалезнай заслоны ездзілі, група была невялікая: 9 танцавальных пар і 6 музыкаў. А быў такі час, калі стараліся туды прыехаць і назад не вярнуцца. Я артыстаў вучыла, што мы прадстаўляем цэлы народ. Запытаюць: «А хто гэта? Беларусы?! Ах, як яны сябе непрыгожа паводзяць, як не па этыкеце ядуць, як неахайна сябе трымаюць». Даводзілася вучыць усяму. Не было ніводнай заўвагі, ні адзін з артыстаў ці музыкаў не застаўся за мяжой. І дзякуючы гэтаму — непарушнай рэпутацыі — мы існавалі. Высветлілася, што ў нас на канцэртах двойчы быў Пётр Міронавіч Машэраў. Без аховы і сакрэтных пераходаў. Бачыла яго аднойчы. Так гучна смяяўся з «Кадрылі»...

## «Зараз мэта — захаваць ужо здабытае»

ЧАМУ, нягледзячы на ўсё, не пакідаю «Харошкі»? Бо не магу інакш. Мне прапаноўвалі калісьці працаваць за мяжой, у Італіі, ставіць іх народныя танцы. Але італьянскія расцей за ўсё зрабіць. Колькі музыкі шыкоўнай! А паспрабуй здабыць тое, пра што ніхто нічога не ведае. Тым больш, мне было шкада таго, што ўжо паспела зрабіць у Беларусі. Шмат было планаў на пастаноўку новых праграм. І я спадзявалася ўсё гэта здзейсніць.

Наш калектыў тры разы быў на мяжы знікнення. Адзін раз аркестр у поўным складзе збег цалкам у Амерыку, у Чыкага. Акрамя аднаго барабаншчыка — майго сына Антона. Уявіце, ансамбль застаўся без музыкальнага суправаджэння. Па логіцы, кіраўнік павінен падаць заяву ад звальненні. Але праз месяц мы робім бенефіс Фёдара Балабайкі, Святланы Каштапавай і Таццяны Царык з новым складам аркестра. Сын, які мае неверагодныя музычныя здольнасці, па памяці аднаўляў партыі кожнага інструмента. Бо музыкі з'ехалі з партыямі і прыхапілі заадно і некалькі інструментаў. А потым то палова складу артыстаў балета з'едзе на заробкі, то аптымізацыя наступіць... А на падрыхтоўку артыста для нашага ансамбля патрэбныя гады. Калі мяне не стане, ансамбль абавязаны жыць, нязменна адраджацца, нібы птушка Фенікс. Цяпер для мяне гэта галоўная задача.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

*Раслінам патрэбна мяккая і адстоеная вада.*

# ЧАМУ ГІНУЦЬ КВЕТКІ Ў ДОМЕ

### 1. Празмерны паліў

Гэта самая частая памылка, праз якую гінуць кветкі ў доме. За выключэннем балотных відаў, напрыклад егіпецкага папіруса (Cyperus papyrus), кветкі не павінны стаяць у вадзе. У залішне мокрай зямлі карані не могуць дыхаць, паступова загніваюць і расліна без здаровых каранёў асуджана на пагібель.

Часта вас можа падмануць сама глеба. На паверхні можа быць сухой, але ўнутры ўтрымліваць яшчэ досыць вільгаці. Гэта проста праверыць з дапамогай драўлянай палачкі: уторкніце яе ў зямлю так, як ўтыкаюць у пірог, правяраючы, ці спёкся ён. Так як і цеста, мокрая глеба прыліпне да палачкі. Калі вынятая палачка будзе сухой, настаў час паліваць. Вады павінна быць столькі, каб яна заставалася ў месцы не даўжэй чым 15 хвілін. Калі лісты вялікія і тонкія, то яны выпарваюць шмат вады. Такія расліны трэба паліваць больш шчодра.

### 2. Высыханне

Без паліву не могуць жыць ніякія расліны. Выключэнне складаюць амаль несмяротныя сукуленты з тоўстым лісцем, у якіх захоўваецца запас вады на цяжкія часы. Калі расліна засохла, але не цалкам высахла, паспрабуйце яе выратаваць. Вазон з кветкай апусціце на некалькі хвілін цалкам у вядро з цеплаватай вадой, таму што перасохлы субстрат, асабліва які змяшчае торф, горш убірае вільгаць. Немалаважна і якасць вады. Раслінам патрэбна мяккая і адстоеная, ні ў якім разе не ледзяная.

### 3. Недастатковае асвятленне

Калі расліна губляе сваю прыгажосць і насычаны колер, значыць, ёй не хапае святла і трэба паставіць кветку як мага бліжэй да акна. На адлегласці ад акна будзе добра ценелюбівым раслінам, такім, напрыклад, як манстэра, якая прывыкла выкарыстоўваць і тую самую малую порцыю святла, якую атрымае ў родным трапічным лесе. Святлолюбівым месца толькі на падаконніку або блізка каля яго. Інтэнсіўнасць святла ўзмоцняць белыя сцены, дапаможа і люстэрка. Самы дарагі варыянт — лямпа дзённага асвятлення.

### 4. Сонечны апёк

Некаторым раслінам шкодзіць і лішак сонца. Напрыклад, прамыя сонечныя прамяні супрацьпаказаны амаль усім архідэям — ім патрабуецца рассеянае святло. Яны вытрымаюць негарачыя прамяні сонца, але паўдзённае сонца, узмоцненае шклом, проста спаліць лісце і расліна загіне.

### 5. Няправільная тэмпература

Кветкі адрозніваюцца ў патрабаваннях да тэмпературы, пра гэта трэба ведаць раней, чым купляць пэўную расліну. Субтрапічныя і міжземнаморскія віды любяць летам цяпло, аднак зімой, як правіла, — адпачынак пры тэмпературы 10—15 градусаў, каб і на наступны год быць прыгожымі і здаровымі. На зімоўку іх лепш выстаўляць на веранды або ў зімовыя сады. А легендарнай камеліі холад проста неабходны. Субтрапічным раслінам не шкодзяць вагонні дзённых і начных тэмператур з вясны да восені.

### 6. Сухое паветра

Недахоп вільгаці ў паветры не загубіць расліну, але акажа ўздзеянне на яе знешні выгляд. Таму ўсе кветкі ў доме (за выключэннем сукулентаў, якім гэта не вельмі важна) трэба апырскваць адзін-два разы на дзень. Калі ў вас няма для гэтага часу, дапамогуць міскі з вадой, пастаўленыя каля вазонаў.

### 7. Шкоднікі

Кветкі ажыўляюць інтэр'ер, але, на жаль, дома падабаецца не толькі ім, але і насякомым, якія імі сілкуюцца. Часцей за ўсё на кветкі нападаюць клешчыкі (павуцінны, цыкламенавы), тля, белакрылка, шчытоўка, трыпс і інш. Каб своечасова іх выявіць, расліны трэба рэгулярна аглядаць. Тлю ўбачыце адразу, але чырвонага павучка не так проста знайсці. Убачыце толькі невялікія павуцінкі на ніжнім баку ліста. Спачатку паспрабуйце няшкоднае для людзей апырскванне на аснове алею і лецыціну, які насякомых склеіць і тым самым загубіць. На яечкі гэтыя сродкі не дзейнічаюць, таму праз тыдзень-два апырскванне трэба паўтарыць.

### 8. Хваробы

Яшчэ больш, чым насякомыя, небяспечныя хваробы, выкліканыя мікраскапічнымі грыбамі і бактэрыямі. Часцей за ўсё пашкоджваюць расліны менавіта грыбкі, што ўтвараюць на лісці карычневыя плямы, якія мокнуць. Гэтыя часткі трэба выдаліць, расліну ізаляваць ад астатніх, а калі хвароба не знікне, апрацаваць фунгіцыдамі па прыкладзенай інструкцыі.

### 9. Недахоп пажыўных рэчываў

Карані раслін хутка спажываюць карысныя рэчывы з глебы ў маленькім вазоне. Таму трэба іх рэгулярна дадаваць, інакш кветкі не будуць расці і прыгажэць. Угнаенняў мноства, прасцей за ўсё карыстацца вадкімі. Яны растворваюцца ў вадзе па інструкцыі і дадаюцца падчас паліву. Можна выкарыстоўваць адзін універсальны сродак або спецыяльныя для раслін з прыгожым лісцем, для тых, якія цвітуць, пальм і г.д. Расліны, якія не пераносяць кальцый, як, напрыклад, цытрусавыя і архідэі, трэба падкормліваць адмысловымі сродкамі. Ад вясны да восені гэта робіць раз у тыдзень, зімой — раз у месяц, а тыя расліны, якія зімуюць у холадзе, не чапаюць наогул. Можна скарыстацца і канцэнтраванымі ўгнаеннямі ў выглядзе таблетак ці палачкі, якіх хопіць на месяц і больш. Аднак пажыўныя рэчывы з іх трапяць не да ўсіх каранёў.

### 10. Занадта маленькі посуд

Калі карані раслiны цалкам запоўняць вазон, кветка не загіне, але не можа расці далей. Таму купіце новы гаршчок і перасадзіце яе! Самы прыдатны час для перасадкі — вясна. Вазон патрабуецца на адзін-два памеры больш. Калі расліна ўжо досыць вялікая і цяжкая, то замяніце хаця б верхні пласт глебы і добра яе падкормлівайце.

Даты | Падзеі | Людзі

## 14 СНЕЖНЯ

**1503** год — нарадзіўся Настрадамус (Мішэль дэ Натрдам), французскі ўрач і астролаг, лейб-медык Карла IX. Аўтар «Стагоддзяў» («Цэнтурый»), якія змяшчалі прадказанні будучых падзей еўрапейскай гісторыі.

**1906** год — у Мінску было заснавана беларускае кніжна-выдавецкае таварыства «Мінчук» (дзейнічала да 1907 года; менавіта ім быў падрыхтаваны да друку першы зборнік паэзіі Я. Купалы «Жалейка»).

**1911** год — 105 гадоў таму Руаль Амундсен дасягнуў Паўднёвага полюса, на месяц апярэдзіўшы англійскую экспедыцыю Роберта Скота.

**1963** год — рабочаму пасёлку Полацкі, які ўзнік у 1958 годзе ў сувязі з будаўніцтвам Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, быў нададзены статус горада абласнога падпарадкавання з назвай Навапалацк.

**1971** год — нарадзіўся Даўгалёнак Дзмітрый Аляксандравіч, беларускі спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР. Чэмпіён XXV Алімпійскіх гульняў (1992), чэмпіён свету, неаднаразовы чэмпіён Савецкага Саюза.

Было сказана

**Георгій МАРЧУК, пісьменнік, публіцыст:**
*«Радасць нават мільёнаў не зменшыць гора аднаго чалавека».*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 9.21 | 16.47 | 7.26 |
| Віцебск | 9.19 | 16.29 | 7.10 |
| Магілёў | 9.12 | 16.37 | 7.25 |
| Гомель | 8.59 | 16.42 | 7.43 |
| Гродна | 9.35 | 17.04 | 7.29 |
| Брэст | 9.27 | 17.13 | 7.46 |

## Месяц

***Поўня 14.12—20.12.***
***Месяц у сузор'і Рака.***

## Імяніны

***Пр.*** *Дзмітрыя, Навума.*
***К.*** *Альфрэда, Яна.*

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА

## УСМІХНЕМСЯ

**Усю вучобу ў музычнай школе мне казалі, што ўменне іграць на скрыпцы спатрэбіцца ў жыцці. І вось яно! Сусед пазычыў у мяне каніфоль для паяльніка!**

— Ганна, а што вы робіце сёння ўвечары?
— Я згодна!

**Маразм — гэта калі жонка схавала ад мяне пляшку каньяку і потым ніяк не можа яе знайсці.**

**А сарказм — гэта калі гляджу на яе і ўсміхаюся, таму што я каньяк даўно знайшоў і выпіў.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4967.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2016 года.